

МАБІЛЬНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЧАЛАВЕКА З ДЗЯРЖАВАЙ 4

ЧАМУ Ў ВЫХАДНЫЯ ВАРТА НАВЕДАЦЬ ГАРАДОК 5




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 ЖНІЎНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 168 (30048)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анастасія КУЦІШЧАВА, начальнік упраўлення каардынацыі развіцця трыкатажнай і швейнай галін «Беллегпрама»:**

*«Беларускія вытворцы ўлічваюць патрабаванні Дзяржаўнага школьнага стандарту, паводле якога адзенне не павінна абмяжоўваць рухі і мае быць бяспечным, зручным, простым у доглядзе. Таму пры вытворчасці выкарыстоўваюцца матэрыялы з дадаваннем натуральных валокнаў — воўны, бавоўны, віскозы, што дазваляе выканаць гігіенічныя патрабаванні. Пры гэтым усе мадэлі класічныя, лаканічныя, натуральны дадатак складае 35-45 %, а астатняе — поліэфір. Ён патрэбен, каб захаваць формаўстойлівасць, каб вырабы лёгка мыліся і не камечыліся падчас выкарыстання. Не трэба палохацца: у рамках гіграскапічнасці, паветрапранікальнасці ўсе патрабаванні выкананыя».*

# БУЛЬБЯНОЕ «ЖНІВО»



У СПК «Гігант» Бабруйскага раёна пачалі капаць бульбу. Вырасла яна тут дыхтоўная, адпаведная назве гаспадаркі — мяркуюць, што будзе 300—350 цэнтнераў з гектара. Галоўны аграном «Гіганта» Уладзімір ЗАЛУЖНЫ *(на здымку)* ураджаем задаволены.

**БелТА.**

## КОРАТКА

• **Беларускія адвакаты ў Дзень ведаў дадуць бясплатныя кансультацыі.**

• У краіне ў ліпені працягнуўся рост рублёвых укладаў насельніцтва.

• **«Белавія» з 20.00 1 верасня прыпыняе продаж білетаў у сувязі з правядзеннем тэхнічных работ па пераходзе на расійскую сістэму браніравання авіябілетаў «Леанарда». Авіякампанія плануе аднавіць аказанне сэрвісаў 2 верасня.**

• Белдзяржцырк падрыхтаваў новую праграму «Віва Карнавал».

• **У краіне ў 2023 годзе здабылі 2 млн тон торфу.**


ISSN 1990 — 763X


Класныя навіны

# Новыя профілі і даследаванне якасці адукацыі

### Што яшчэ чакае школы з 1 верасня?

**«Беларусь і Я — дыялог міру і стваральнай працы» — менавіта так сфармулявана тэма першага ўрока, які дасць старт новаму навучальнаму году ў беларускіх школах. Ва ўрачыстых мерапрыемствах возьмуць удзел вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў.**

### ПАВЫШЭННЕ НАДБАВАК ЗА РАБОТУ Ў ГАЛІНЕ

1 верасня свае дзверы для хлопчыкаў і дзяўчынак расчыняць 2865 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку дзве новыя школы: у Гродне (на 1020 месцаў) і ў аграгарадку Сеніца пад Мінскам (на 720 месцаў). А ўсяго за парты сядзе каля мільёна школьнікаў, з іх — 110 тысяч першакласнікаў. На рамонтныя работы, у тым ліку на падрыхтоўку ўстаноў адукацыі да 2023/2024 навучальнага года, з бюджэту было выдаткавана больш як 300 мільёнаў рублёў (летась — больш як 196 мільёнаў). Сродкі рэспубліканскага бюджэту, апроч іншага, выдзяляліся на пастаўку абсталявання для кабінетаў фізікі, хіміі, біялогіі.


СТАР. 3


Жыццялюбы

# МАРА АБ НЕБЕ

### Кіроўца аўтакрана пасля 50 скончыў курсы пілота і на юбілей сваёй мамы прыляцеў на самаробным самалёце

**Гэтую натхняльную гісторыю, якая выклікае выключна захапленне, я даведалася ад дачкі Мікалая КАЧАНА — заснавальніцы жаночага клуба «Шчасце сваімі рукамі», які існуе пры Смалявіцкім раённым цэнтры культуры, вядучай трансфармацыйных гульняў Веранікі Піванковай.**



**Мікалай Дзмітрыевіч побач з дачкой Веранікай каля самалёта, які ён канструяваў разам з сябрам у гаражы.**


СТАР. 13

# Сувязі выбудаваны

## Кантракты на 50 мільёнаў рублёў плануецца падпісаць падчас Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму

**З 4 да 7 верасня наша краіна прыме першы Беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум. Толькі ў яго пленарным пасяджэнні возьме ўдзел больш за 500 чалавек, акрамя таго, прадугледжана работа шасці секцый. Да падпісання плануюцца кантракты і пагадненні на суму каля 50 мільёнаў рублёў. У рамках форуму Беларусь наведае і Старшыня Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзіла НАРБАЕВА, якая сустрэнецца з кіраўніцтвам нашай краіны. Арганізатарам форуму выступае Савет Рэспублікі. Учора яго Старшыня Наталля КАЧАНАВА правяла нараду з нагоды маючага адбыцца мерапрыемства.**

У апошнія дні колькасць удзельнікаў форуму з узбекскага боку павялічылася з 46 да 100 чалавек. Гэта парламенцкая дэлегацыя і прадстаўнікі бізнесу, акрамя таго, каля 20 узбекскіх прадпрыемстваў будзе прадстаўлена на выстаўцы, што пройдзе ў рамках форуму.

— Выдатна, што ў нас такая колькасць гасцей, гэта тое, да чаго мы імкнуліся. Бо мы сур'ёзна рыхтуемся і хацелася б, каб форум прайшоў на высокім узроўні, разлічваем на выніковую работу. Да таго ж у нас не проста бізнес-форум, а афіцыйны візіт маёй калегі, кіраўніка Олій Мажліса Танзілы Камалаўны Нарбаевай, — адзначыла Наталля Качанава.

Падчас форму будзе працаваць шэсць секцый — па прамысловасці, лёгкай прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры.

— Мы пастараліся ахапіць усе кірункі, каб пазнаёміць гасцей з тым, што ёсць у нашай краіне, і падзяліцца вопытам. Хацелася б, каб секцыйная работа была насычаная змястоўнымі, практыкапрымяняльнымі выступленнямі, — дадала Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы ўбачылі, як моцна развіваецца Узбекістан, і вядома, нам важнае супрацоўніцтва з адным са стратэгічных партнёраў. Акрамя таго, мне вельмі хочацца, каб мы ва ўсёй красе паказалі нашу краіну.

Наталля Качанава падкрэсліла, што сувязі паміж краінамі па многіх кірунках ужо выбудаваныя, прывёўшы ў якасці прыкладу супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, у прыватнасці, сумесныя праграмы паміж БНТУ і узбекскімі ВНУ. Акрамя таго, спікер Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на ўдзел у форуме губернатараў і іх намеснікаў і важнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Важныя і мерапрыемствы, якія будуць праводзіцца ў рамках форуму. Сярод іх — канцэртная праграма. Яна дасць гасцям уяўленне аб беларускіх традыцыях і культуры. Будзе аддадзена ўвага супрацоўніцтву па лініі маладзёжных арганізацый і Беларускага саюза жанчын. І безумоўна, адметнай падзеяй стане выстаўка, дзе возьмуць удзел у тым ліку прамысловыя прадпрыемствы Беларусі і Узбекістана.

— Хочацца, каб гэта было цікава, запамінальна, а самае галоўнае — каб такія мерапрыемствы ў нас сталі традыцыйнымі. Мы можам прадугледзець іх правядзенне з пэўнай перыядычнасцю і па іншых кірунках, якія могуць быць цікавыя для нашых краін, — рэзюмавала Наталля Качанава, адзначыўшы, што прапрацавана і плануецца да падпісання кантрактаў і пагадненняў на суму каля 50 мільёнаў рублёў.

— Мы разлічваем, што правядзенне дадзенага форуму надасць новы імпульс развіццю дзелавых адносін паміж Беларуссю і Узбекістанам. Перш за ўсё мы вызначалі гэтыя кірункі, вылучыўшы іх з дарожнай карты развіцця двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін, якую падпісалі кіраўнікі ўрадаў нашых краін. Секцыі будуць прысвечаныя развіццю адносін у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы, адукацыі, культуры і турызме. Чакаецца, што будзе падпісана каля 20 пагадненняў і мемарандумаў аб супрацоўніцтве, а таксама камерцыйныя кантракты, — расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

Ён адзначыў, што жанчыны актыўна ўключыліся ў актывізацыю адносін Беларусі і Узбекістана ў першую чаргу ў гандлі, інвестыцыйным супрацоўніцтве, наладжванні прамысловых кааперацыйных сувязяў.

— Як падкрэслівае Прэзідэнт нашай краіны, сёння аснова — гэта эканоміка. І форум прысвечаны таму, каб выкарыстоўваць той эканамічны патэнцыял, які ёсць у Беларусі і Узбекістана. Важна яго цалкам задзейнічаць у няпростых міжнародных умовах, калі на Беларусь аказваецца эканамічны ціск, але мы ўмела трымаем удар і выкарыстоўваем усе магчымасці, — падкрэсліў Сяргей Рачкоў.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** расказала пра работу секцый у галіне прамысловасці. Яна пройдзе на прадпрыемстве БелАЗ у Жодзіне. У ёй возьмуць удзел прадстаўнікі Узбекістана ў галіне машынабудавання, ліфтавага абсталявання і іншых.

— Будзе ісці гаворка аб супрацоўніцтве ў галіне машынабудавання. Гэта для нас цікавы рынак. Прэзідэнт заўсёды ставіць задачу пашыраць тэрыторыю нашага экспарту. Мяркую, што па выніках работы секцыі на БелАЗе будуць заключаны кантракты на пастаўку трактароў, аўтамабільных шын і іншай прадукцыі. І зразумела, самае галоўнае — абмеркаваць далейшае супрацоўніцтва, магчымае наладжванне кааперацыйных ланцужкоў і стварэнне сумесных прадпрыемстваў.

Яшчэ адна секцыя будзе прысвечана супрацоўніцтву краін у галіне лёгкай прамысловасці. Яна пройдзе на базе сталічнага Палаца мастацтваў з наведваннем прадпрыемства «Камволь».

— Спадзяюся, што ўзбекскіх калег зацікавіць наша знакавае прадпрыемства па вытворчасці тканін. З узбекскага боку прыедуць прадстаўнікі фабрык па пашыве спецадзення, бялізнавага трыкатажу, дзіцячага адзення. Нашай лёгкай прамысловасці ёсць чым падзяліцца, і бясспрэчна, мы раскажам пра тое, у чым Беларусь можа канкурыраваць на рынку Узбекістана, — дадала Таццяна Рунец.

Таксама ў рамках работы секцыі мяркуецца заключыць пагадненне аб стварэнні сумеснага прадпрыемства па вытворчасці абутку паміж айчынным вытворцам «Марка» і ўзбекскай кампаніяй.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Ноччу на 30 жніўня адбылася масавая атака ўкраінскіх беспілотнікаў на рэгіёны Расіі

Сілам СПА Расіі ўдалося збіць большасць лятальных апаратаў. У выніку нападаў ніхто не пацярпеў, аднак не абышлося без разбурэнняў. Так, на аэрадроме ў Пскове атрымалі пашкоджанні некалькі ваенна-транспартных самалётаў, узнік пажар, паведамляе БелТА.

Каля дзвюх гадзін ночы Мінабароны РФ паведаміла, што расійскія сродкі СПА збілі тры ўкраінскія беспілотныя самалётнага тыпу над тэрыторыяй Бранскай вобласці. Пры падзенні збітага беспілотніка быў пашкоджаны адміністрацыйны будынак. Пазней адбыўся яшчэ адзін налёт — два беспілотнікі спрабавалі атакаваць тэлевежу ў Бранску. Тым часам два БПЛА былі спыненыя над тэрыторыяй Арлоўскай вобласці. Праз паўгадзіны з'явілася інфармацыя аб знішчэнні БПЛА над тэрыторыяй Калужскай вобласці, там адзін з беспілотнікаў трапіў у пусты рэзервуар для захоўвання нафтапрадуктаў. Разанскую вобласць за ноч УСУ атакавалі двойчы — з розніцай у паўтары гадзіны. У абодвух выпадках украінскія беспілотнікі былі збітыя.

Бліжэй да раніцы мэр Масквы Сяргей Сабянін паведаміў, што сілы СПА збілі ў Рузскім раёне адзін з беспілотнікаў, якія накіроўваліся да Масквы. У сувязі з інцыдэнтам аэрапорты Дамадзедава, Унукава і Шарамецьева часова не прымалі і не адпраўлялі рэйсы. А вось у Пскове пасля нападу БПЛА на аэрапорт адбыўся пажар, у выніку якога загарэліся чатыры паветраныя судны ваенна-транспартнай авіяцыі Іл-76. Каля трох гадзін ночы УСУ з дапамогай марскіх беспілотнікаў таксама спрабавалі атакаваць цэнтральную бухту Севастопаля, дзе былі адбітыя сіламі супрацьпадводна-дыверсійнага забеспячэння.

### Кіраўнік МЗС Турцыі 31 жніўня — 1 верасня наведае Расію і сустрэнецца з Лаўровым

Кіраўнік МЗС Турцыі Хакан Фідан 31 жніўня — 1 верасня наведае з візітам Расію і сустрэнецца са сваім расійскім калегам Сяргеем Лаўровым. Аб гэтым заявіла афіцыйны прадстаўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства Марыя Захарава, паведамляе ТАСС.

Паводле слоў Захаравай, кіраўнікі ведамстваў абмяркуюць шырокі спектр пытанняў двухбаковага і міжнароднага парадку дня, у тым ліку сітуацыю на Украіне, Закаўказзе, Сірыі і Лівіі. Міністры таксама аддадуць увагу расійска-турэцкаму супрацоўніцтву, у тым ліку пытанням, якія датычацца рэалізацыі стратэгічных праектаў у энергетычнай сферы, і прапрацуюць графік двухбаковых кантактаў на вышэйшым узроўні.

### Вайсковы пераварот адбыўся ў афрыканскім Габоне

Раніцай 30 жніўня стала вядома, што дзеючы прэзідэнт Габона Алі Бонга Андзімба пераабраны на чарговы тэрмін, набраўшы 64,2 % галасоў. Адразу пасля таго ваенныя Габона ў тэлеэфіры заявілі аб адмене вынікаў выбараў, што прайшлі ў краіне, роспуску ўсіх інстытутаў улады і стварэнні камітэта па пераходзе і аднаўленні інстытутаў. Высокапастаўлены афіцэр таксама аб'явіў, што граніцы Габона будуць закрытыя да далейшага распараджэння. СМІ паведамлялі аб стральбе ў сталіцы краіны Лібрэвілі. Была ўведзена каменданцкая гадзіна. Пазней з'явілася інфармацыя Agence France-Presse пра тое, што прэзідэнт Габона Алі Бонга Андзімба змешчаны пад хатні арышт, а адзін з сыноў прэзідэнта Габона арыштаваны за «дзяржаўную здраду».

## Па сутнасці

# СІЛА ВЕДАЎ



Усе мы адчувалі шчасце — хоць бы імгненні. У дзяцінстве гэтыя імгненні цягнуцца даўжэй. Бо ў дзяцінстве мы чыстыя. Не залілі ў сваю галаву інфармацыйны бруд, не запэцкалі свае сэрцы дрэннымі ўчынкамі. Хараша. Мне заўжды было хораша, калі заўзята падарожнічаў па краіне ведаў. Адчуваў шчасце ад набыцця новых ведаў. І шматлікія цацкі былі ў баку, калі ў руках новая кніга альбо па беларускім радыё гучала публіцыстыка. Адчуваў шчасце і ў местачковай бібліятэцы, названай у гонар светача беларускай навуковай думкі — Ігнатоўскага, і ў «чыталцы» БДУ з вялізнымі вокнамі ва ўнутраны сквер з яго зялёнымі шатамі. Адукацыя — гэта таксама акно альбо дзверы ў свет. І ў літаральным сэнсе — і ўвогуле. Адукацыя выхоўвае і фарміруе чалавека. А ў выніку — і краіну.

Чытаеш кнігу, адгортваеш новую старонку інфармацыі, ныраеш у акіян ведаў. Кожная порцыя — нібы глыток шчасця. Па фізіцы — меншага аб'ёму, па матэматыцы — іншага кшталту, па гісторыі і літаратуры — здаецца, трапіў у глыбіню пушчы. Такое чыстае паветра. І адразу ў памяці ажываюць маляўнічыя вобразы роднага краю. Вось ляціш па-над Прыпяццю, тут завітаў у непралазны гушчар, дзе хутка расцвіце папараць-кветка. А там дойліды будуюць вежу... Чутны грукат мячоў, Вітаўт вядзе ў бой дружыны пад Грунвальдам. Веды-мары-ўяўленні... А ёсць канкрэтнае. Скарына на друкарскім станку адбівае ў летапісе народа магчымасць «людзьмі звацца». Без сваёй кнігі, без навуковай школы, без сваіх універсітэтаў — усяго таго, што захоўвае і памнажае нашы веды, — былі б мы народам, нацыяй, дзяржавай? Так бы і засталіся нашы перамогі — міфічнымі аповедамі, шматвяковыя набыткі — страчанай спадчынай.

Ці не таму заваёўнікі заўжды «палявалі» на кнігі — носьбіты асветы і думкі народа. Ці не таму сёння сучасныя транснацыянальныя гегемоны, нібы на ланцуг, прывязваюць людзей да віртуальных сродкаў перадачы і атрымання інфармацыіі. А што? Усе бібліятэкі не знішчыш. Сучасныя герастраты выбралі больш дзейсны шлях. Аўтарытэт кніг і нацыянальнай адукацыі замянілі ўніфікаванымі адносінамі да ведаў. Яны безаблічныя і нібы агульныя. А насамрэч — знішчальныя для нацыяльнай ідэі. Таму і навязваюць новы трэнд — адмену культуры. Лайтова! Тое ж, што ўрокі не вучыць — лёгка, але шлях да невуцтва.

Мы, напэўна, свае геапалітычныя ўрокі вывучылі. Больш не падтрымліваем тэндэнцыі, што вядуць да невуцтва. Шмат чаго зламалі, цяпер зноў ствараем. Адукацыйныя дойліды — выкладчыкі ўніверсітэтаў. Нават сучасны філосаф палітычнай думкі — Бжэзінскі — папярэджваў: хто не будзе карміць свайго настаўніка, той будзе карміць іншаземцаў. У Беларусі настаўнік і ўрач — цэнтральныя фігуры палітыкі дзяржавы, увагі Прэзідэнта. Кажам «настаўнік» — маем на ўвазе ўсю інтэлегенцыю, бо без ведаў няма краіны. Аб тым казалі нашы класікі. Вуснамі Лабановіча, напрыклад. І нават ідэолаг нацыянальнай ідэі — Міхал з «Новай зямлі» — марыў аб адукацыі для сваіх дзяцей. А значыць, для будучыні. І наша краіна прайшла гэты шлях: ад «дарэктараў» у леснічоўках да Караля і Даніловіча — рэктараў вядучых ВНУ краіны.

Адукацыя — гэта прыярытэт дзяржавы. Гэта не сфера паслуг. Не, ад замежных студэнтаў мы не будзем хаваць веды. Хай прыносяць краіне грошы, найлепшых запросім застацца, а тыя, што вернуцца на радзіму, — будуць носьбітамі ведаў аб нашай краіне. Але паслугі — не галоўнае. Галоўнае — выхаваць БЕЛАРУСА як сапраўднага чалавека і патрыёта. Бо мы — краіна хлебаробаў і Лабановічаў. Заўсёды імкнуліся да міру і спасціжэння навакольля. То наша радавое — прага да ведаў. Нават праз сотні кіламетраў паўз пушчы і балоты. З Полацка да Падуі. Ад кніг Скарыны з пражскай тыпаграфіі для люду паспалітага да Купалы «эй, каб цёмен не быў, чытаць кніжкі ўмеў...» Ад сціплых кніжачак з друкарні пана Марціна Кухты да шыкоўных выдавецтваў. Гэта — наша. Любім і ганарымся. Гэтаму трэба таксама вучыць. Любіць Радзіму, паважаць род і родную сімволіку — выхоўваць грамадзяніна. Інакш за нас тое зробяць іншыя. Адукацыя — гэта заўжды момант ісціны, прышчэпка ад касмапалітызму, ад духоўнага забыцця. Ад паўтарэння падзей 2020-га.

А сёння грамадства чакае чарговы іспыт. Штучны інтэлект. Падкупляе сваімі перспектывамі. Гуляе нашымі слабасцямі. Вучыць лайдачыць. Адбірае розум. А потым — увогуле — чалавека. Ад падмены да замены — невялікі крок. І яшчэ меншы гістарычны перыяд. Лічбавы носьбіт заменіць чалавека як носьбіт інфармацыі. Вучыцеся, назапашвайце веды. Адукацыя цяпер — не толькі пра магчымасць застацца ў геапалітычнай прасторы. Адукацыя — гэта магчымасць, каб чалавека не знішчылі адным націсканнем клавішы «Delete».

На нядаўняй сустрэчы ў БДУ Прэзідэнт выказаў... не, не крытыку, больш развагу пра ролю навуковай інтэлігенцыі ў жыцці краіны. І пра нейкую пасіўнасць. Сапраўды, калі не дацэнты і рэктары будуць светачамі грамадства, то хто? Навуковае асяроддзе — гэта ж і прастора для нацыянальнага дыялогу, вырашэння самых спрэчных пытанняў найбольш мірным і цывілізаваным спосабам. Адмаўчацца сёння не атрымаецца. Не толькі словы павінны быць сапраўднымі, але і ўчынкі. Бо адукаванасць — гэта не толькі пра пасады і крэслы, не толькі высокія званні і колькасць манаграфій. Гэта яшчэ і культура паводзін, стан душы, жаданне зберагчы Радзіму. Бо чым больш чалавек ведае, тым больш ён разумее, што мы маем, тым больш хоча тое зберагчы. Гэта «аз» і «букі», «альфа» і «амега» існавання любой незалежнай дзяржавы.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Новыя профілі і даследаванне якасці адукацыі

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле інфармацыі органаў кіравання на месцах, у новым навучальным годзе ўстановы адукацыі будуць укамплектаваныя педагагічнымі кадрамі ў поўным аб'ёме. Сёлета шэрагі педагогаў папоўнілі 5,5 тысячы маладых спецыялістаў. Між іншым, з 1 верасня дадатковая нагрузка на педагогаў будзе аплачвацца ў залежнасці ад напаўняльнасці класаў у школах і ўстановах спецыяльнай адукацыі. Гаворка ідзе аб аплатных гадзінах арганізацыйна-выхаваўчай работы і нагрузцы па праверцы сшыткаў. Таксама з 1 верасня памер надбаўкі за работу ў галіне настаўнікам павялічаць на 15 працэнтаў: з 6 да 21 працэнта.

Трэба заўважыць, што папярэдні навучальны год запомніўся беларускім школьнікам шэрагам новаўвядзенняў: у першую чаргу, змяненнем формы выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы, увядзеннем цэнтралізаваных экзаменаў для адзінаццацікласнікаў, пілотным праектам па арганізацыі харчавання, пашырэннем сеткі профільных класаў, увядзеннем новых прывілеяў для таленавітай і адоранай моладзі.


Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ІНЖЫНЕРНЫЯ І ТРАНСПАРТНЫЯ КЛАСЫ

Далей прафесійная прафілізацыя навучання (асабліва на старшай ступені школы) будзе толькі паглыбляцца. Профільныя класы, дзе будуць рыхтаваць будучых спецыялістаў для авіяцыйнай галіны, адкрыюцца ў новым навучальным годзе ў сталічных установах адукацыі. Акцэнт у вучэбнай праграме будзе зроблены на вывучэнні матэматыкі і англійскай мовы. Таксама для вучняў профільных класаў будуць праводзіцца тэматычныя факультатыўныя заняткі. Адной з адметнасцяў стане форменнае адзенне, якое будуць насіць іх навучэнцы.

Актыўна ствараюцца па ўсёй краіне і інжынерныя класы, якія працуюць у цеснай звязцы з універсітэтамі і прамысловымі прадпрыемствамі. Навучальную праграму курса распрацаваў вядучы тэхнічны ўніверсітэт краіны — БНТУ. Для залічэння ў інжынерны клас школьнікі павінны мець сярэдні бал па профільных прадметах (фізіцы, матэматыцы, хіміі) не ніжэйшы за «7». Пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі па выбраным профілі для вучняў інжынерных класаў будзе прадугледжаны шэраг прывілеяў.

Таксама з 1 верасня пачнуць працаваць яшчэ шэсць транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці. Яны адкрыюцца ў Віцебску, Гомелі, Брэсце, Мінску, Жлобіне і Калінкавічах. Навучэнцы транспартных класаў будуць знаёміцца з асаблівасцямі прафесіі чыгуначніка. У праграме навучання прадугледжаны экскурсіі на прадпрыемствы Беларускай чыгункі, дзе дзеці змогуць убачыць усё тое, пра што ім будуць расказваць на занятках педагогі. У папярэднім навучальным годзе ў краіне функцыянавалі дзевяць транспартных класаў, у якіх праходзіла навучанне больш за 200 навучэнцаў сярэдніх школ з Баранавіч, Лунінца, Ліды, Магілёва і Гомеля. З удзелам Беларускай чыгункі для навучэнцаў транспартных класаў распрацавана праграма аб'яднання па інтарэсах «На шляху да прафесіі: асновы чыгуначнага транспарту» для вучняў 8—9-х класаў і вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў прафесіі чыгуначнага транспарту» для вучняў 10—11-х класаў.

Асноўная мэта дадзенага профілю — папулярызацыя чыгуначных прафесій і стварэнне ўмоў для іх усвядомленага выбару навучэнцамі. Навучэнцы, якія паспяхова скончылі транспартныя класы, змогуць атрымаць мэтавае накіраванне для паступлення ва ўстановы адукацыі, што рыхтуюць спецыялістаў для работы на Беларускай чыгунцы.

У сталіцы колькасць класаў ваенна-патрыятычнай накіраванасці ў параўнанні з мінулым годам павялічыцца практычна ў пяць разоў. Яшчэ адна навінка — адкрыццё аграрных класаў у дзвюх мінскіх школах.

## ЦЭ І ПЕРАНОС ВЫПУСКНЫХ ВЕЧАРОЎ

З 1 верасня ў вучэбнай праграме беларускіх школ з'явіцца два новыя факультатывы: вучням 9—10-х класаў (навучальны курс разлічаны на два гады) прапанавалі дадаткова вывучаць «Святыні роднага краю», а вучням 6-х класаў — «Духоўную спадчыну Беларусі (IX стагоддзе — 1569 год).

Згодна з Канцэпцыяй школьнай гістарычнай адукацыі цяпер распрацоўваецца змест новага курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». Вучэбная праграма курса абмяркоўвалася на дыялогавых пляцоўках у лютым-сакавіку бягучага года і была дапрацавана з улікам заўваг і прапаноў педагогаў. Новы вучэбны дапаможнік будзе праходзіць апрабацыю з 1 верасня ў 14 установах агульнай сярэдняй адукацыі краіны. Усяго на 2023 год запланавана перавыданне 29 навучальных дапаможнікаў, прычым 24 з іх будуць перавыдадзены да 1 верасня.

**Адно з самых актуальных для будучых выпускнікоў пытанне — выніковая атэстацыя.** Нацыянальны інстытут адукацыі праводзіў сацыялагічнае даследаванне па пытаннях правядзення цэнтралізаванага экзамену. Так, з 6,5 тысячы педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія ўзялі ўдзел у анкетаванні, 78 працэнтаў станоўча ацэньваюць навацыю. Многія прапановы педагогаў па ўдасканаленні цэнтралізаванага экзамену на цяперашні час ужо ўлічаны. У прыватнасці, гэта закранае час правядзення іспытаў: **плануецца, што ў новым навучальным годзе яны пройдуць 27 і 30 мая**, адпаведна, будуць перанесены на больш позні час выпускныя вечары. Што датычыцца сістэмы падліку балаў, то яна будзе максімальна празрыстай і зразумелай кожнаму ўдзельніку ЦЭ ды кожнаму з бацькоў.

А ў лістападзе бягучага года ўпершыню ў нашай краіне пройдзе Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі, накіраванае на праверку і ацэнку сфарміраванасці функцыянальнай дасведчанасці навучэнцаў, якія атрымалі базавую адукацыю (фінансавай, чытацкай, прыродазнаўчай і матэматычнай). Плануецца, што яно ахопіць каля 20 тысяч дзесяцікласнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і першакурснікаў устаноў адукацыі, якія рэалізоўваюць праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Кожнаму з іх будзе прапанавана на працягу 90 хвілін выканаць работу з заданнямі на два віды дасведчанасці.

Таксама даследаванне прадугледжвае анкетаванне, нацэленае на выяўленне фактараў, якія маглі паўплываць на фарміраванне функцыянальнай дасведчанасці. Мяркуецца апытаць чатыры катэгорыі рэспандэнтаў: вучняў, іх бацькоў (законных прадстаўнікоў), педагогаў і прадстаўнікоў адміністрацыі ўстаноў адукацыі. Арганізаваць мерапрыемства плануецца на электроннай платформе, распрацоўкай якой займаецца Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі. Неабходныя ў падрыхтоўцы да даследавання і яго правядзення матэрыялы будуць паслядоўна выкладвацца на Нацыянальным адукацыйным партале, дзе ўжо створаны спецыяльны раздзел. У верасні плануюць размясціць рэпетыцыйны варыянт даследавання і правесці трэніровачнае тэсціраванне платформы.

Харчаваннем у новым навучальным годзе па краіне забяспечаць каля 1 мільёна школьнікаў. Прычым падыходы да яго арганізацыі мяняюцца. З 1 верасня больш за 60 працэнтаў школ пяройдзе на новы прынцып, які быў апрабаваны ў рамках пілотнага праекта.

Да таго ж школьнае меню будзе скарэкціравана. Гатаваць школьныя кухары будуць, арыентуючыся на падрыхтаваны Міністэрствам адукацыі інфармацыйны зборнік тэхналагічных картаў, страў і вырабаў, распрацаваны з улікам смакавых пераваг навучэнцаў. Большасць з іх была атрымана падчас эксперыменту. Як паказаў пілотны праект, новае меню дазволіла зменшыць узровень адходаў да 10-20 працэнтаў, а раней гэты паказчык даходзіў да 50-60 працэнтаў. Між іншым, Міністэрства адукацыі Беларусі запусціла чат-бот у месенджары Telegram, куды жыхары краіны могуць звяртацца па пытаннях арганізацыі харчавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПАДРУЧНІК — У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ!

Міністэрства адукацыі будзе збіраць меркаванні беларусаў пра школьныя падручнікі.

Пытанне аб якасці вучэбных дапаможнікаў неаднаразова ўзнімалася Прэзідэнтам краіны. Так, на апошняй тэматычнай нарадзе кіраўнік дзяржавы даручыў стварыць маніторынгавую групу, якая зоймецца тэмай якасці падручнікаў. У яе ўвойдуць вучоныя, спецыялісты, філолагі.

У Міністэрстве адукацыі прапанавалі выказацца на гэты конт таксама настаўнікам, бацькам і проста неабыякавым грамадзянам.

«Зразумела, што якасць падручніка павінен ацэньваць найперш спецыяліст, але і меркаванне звычайных людзей таксама важнае», — растлумачылі ў ведамстве.

У выпадку выяўлення памылак у падручніках або для ўнясення пэўных прапаноў па іх удасканаленні трэба зайсці на Нацыянальны адукацыйны партал (adu.by) і запоўніць там электронную форму. Усе заўвагі будуць прааналізаваныя супрацоўнікамі Нацыянальнага інстытута адукацыі.

У Міністэрстве адукацыі таксама дадалі, што тых, хто знойдзе найбольшую колькасць памылак у падручніку, чакае заахвочванне.

Будзьце ў курсе

# ВЫХАДНЫ ДА 1 ВЕРАСНЯ І НА ВЫПУСКНЫ

## Прадугледжаныя для бацькоў школьнікаў у «мясцовых канстытуцыях»

**Нормы дадатковай падтрымкі работнікаў, якія выхоўваюць дзяцей-школьнікаў, абазначаны ў абсалютнай большасці калектыўных дагавораў — так званых мясцовых канстытуцыях, якія ўзмацняюць сацыяльныя гарантыі, прапісаныя на заканадаўчым узроўні, сцвярджаюць у Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Бацькі вучняў могуць атрымаць выхадны, каб пайсці на ўрачыстую лінейку ці выпускны баль дзіцяці, а таксама атрымаць грашовыя дапамогі за добрую вучобу школьніка.**

Вядома, змест кожнага канкрэтнага лакальнага нарматыўна-прававога акта залежыць ад фінансавых магчымасцяў прадпрыемства, аднак у большасці выпадкаў наймальнікі знаходзяць варыянты, як аказаць неабходную дапамогу сваім работнікам, што маюць дзяцей-школьнікаў, запэўнілі ў прэс-службе ФПБ:

— У Ляхавіцкай жыллёва-камунальнай гаспадарцы, напрыклад, прадугледжаны выхадны з захаваннем заробку не толькі падчас урачыстай лінейкі, але і ў дзень апошняга званка і выпускнога балю. Пабыць з дзецьмі ў Дзень ведаў могуць і супрацоўнікі Лепельскага малочнакансервавага камбіната. І падобных прыкладаў шмат. А ў многіх арганізацыях распаўсюджана аказанне дапамогі на набыццё школьных прылад, канцылярскіх тавараў, уручэнне падарункавых сертыфікатаў на куплю неабходных тавараў для школы. Некаторыя калектыўныя дагаворы ўключаюць нормы, згодна з якімі бацькам выплачваецца матэрыяльная дапамога за добрую паспяховасць іх вучняў.

Напярэдадні пачатку навучальнага года прафкамы прадпрыемстваў ладзяць святы для будучых першакласнікаў, каб тыя запомнілі гэты дзень і з яшчэ большым жаданнем пайшлі вучыцца. Для дзетак арганізоўваюць яркія спектаклі, конкурсы, забаўляльныя праграмы, экскурсіі. Малым уручаюць партфелі, наборы для творчасці, пазнавальныя гульні.

З 2002 года Федэрацыя прафсаюзаў праводзіць дабрачынную акцыю «Прафсаюзы — дзецям», у рамках якой аказваецца падтрымка не толькі работнікам прадпрыемстваў, але і дзіцячым дамам, школам-інтэрнатам, сацыяльным прытулкам, а таксама дзецям са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, дзецям-інвалідам. Летась падчас падрыхтоўкі дзяцей да школы прафсаюзныя арганізацыі краіны выдаткавалі на матэрыяльную падтрымку каля васьмі мільёнаў рублёў.

**Ірына СІДАРОК.**

# МАБІЛЬНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЧАЛАВЕКА З ДЗЯРЖАВАЙ

## Новыя магчымасці і перавагі развіцця электронных паслуг у Беларусі

**Сотні дзяржаўных лічбавых паслуг праз Адзіны партал электронных паслуг (АПЭП) у Беларусі атрымліваюць ужо далёка не першы год. На пляцоўцы цяпер сабрана 307 электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур для розных катэгорый грамадзян: бізнесу, людзей, замежнікаў ці іншаземных юрыдычных асоб. У асабістым электронным кабінеце на АПЭП даступна 112 электронных адмінпрацэдур і 195 паслуг. Плануецца, што праз два гады іх колькасць павялічыцца ўдвая, а напрыканцы 2023-га ці ў першай дэкадзе 2024-га запрацуе мабільная праграма, з дапамогай якой можна будзе атрымаць шэраг паслуг і сэрвісаў на партале праз смартфон. Пра асаблівасці і планы развіцця лічбавых сэрвісаў у Беларусі расказалі спецыялісты Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП).**



### СЭРЦА АДЗІНАГА ПАРТАЛА

Адзіныя анлайн-пляцоўкі, на якіх сабраныя дзяржаўныя паслугі, існуюць ва ўсіх краінах, якія лічацца найбольш прасунутымі ў плане аказання электронных паслуг (па даследаваннях ААН), накшталт Даніі, Эстоніі, Паўднёвай Карэі, Аўстраліі, Фінляндыі. Рэалізавана яна і ў Беларусі — гэта Адзіны партал электронных паслуг (АПЭП), які змешчаны па адрасе platform.gov.by, расказала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП**:

— Сэрца партала — электронны асабісты кабінет, аўтарызаваўшыся ў якім карыстальнікі могуць атрымаць доступ да паслуг партала. Летась і АПЭП, і асабісты кабінет былі істотна мадэрнізаваны і пераведзены на новую платформу, дзе ў людзей, у прыватнасці, з'явілася магчымасць прайсці аўтэнтыфікацыю з дапамогай ID-карткі. Тыя, у каго няма новых дакументаў, могуць аўтарызавацца (прайсці строгую аўтэнтыфікацыю) з дапамогай ключа электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП). Або прайсці нястрогую аўтэнтыфікацыю з выкарыстаннем уліковых запісаў Google ці Facebook, адраса электроннай пошты ці нумара тэлефона, па логіне і паролі. Аднак большасць паслуг на партале патрабуе менавіта строгай аўтэнтыфікацыі, так што перавага будзе на баку ўладальнікаў ID-картак ці ключа ЭЛП.

Колькасць электронных паслуг на партале раней была большай, чым адмінпрацэдур. Аднак у апошнія гады намецілася тэндэнцыя, што больш карпатлівая работа вядзецца менавіта па пераводзе ў электронны выгляд адміністрацыйных працэдур. Згодна з пастановай прэм'ер-міністра № 119р, вызначаны канкрэтныя спісы адмінпрацэдур пэўных дзяржорганаў, якія неабходна перавесці ў электронны выгляд (з указаннем тэрмінаў і адказных выканаўцаў).

### СІСТЭМА ASSIST, ЛІЧБАВЫ РАХУНАК І ПОШТА

Яшчэ адным нbadaўвядзеннем асабістага кабінета стала магчымасць аплаты паслуг не толькі праз АРІП, але і з дапамогай сістэмы Assist, іншымі словамі, з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак.

— З'явілася таксама паняцце «лічбавы рахунак». Калі чалавек пры строгай аўтэнтыфікацыі ўваходзіць у свой асабісты кабінет, да яго аўтаматычна прывязваецца лічбавы рахунак, які мае дачыненне толькі да асабістага кабінета. Такі рахунак можна папоўніць і пасля атрымліваць паслугі, грошы за якія будуць спісвацца з гэтага рахунку, — удакладніла начальнік аддзела НЦЭП. — Лічбавы рахунак існуе як для фізічных асоб, так і для арганізацый.

У абноўленым асабістым кабінеце з'явілася электронная пошта, па якой грамадзяне могуць абменьвацца юрыдычна значнай карэспандэнцыяй паміж сабой ці з арганізацыямі.

— Любыя даведкі, выпіскі, звесткі, якія трапляюць у асабісты кабінет чалавека ў выніку аказання адмінпрацэдуры, маюць юрыдычную моц, бо будуць падпісаны ЭЛП адпраўшчыка і атрымальніка, — акцэнтавала ўвагу Святлана Караневіч. — Цэнтр цяпер працуе над стварэннем сэрвісу праверкі валідацыі (сапраўднасці) такіх дакументаў.

### АДМІНПРАЦЭДУРЫ ПАВІННЫ МЕЦЬ ЛІЧБАВЫ ЭКВІВАЛЕНТ

Адміністрацыйныя працэдуры — гэта розная кшталту ўзаемадзеянне грамадзян і бізнесу з дзяржавай. Хочаш зрабіць зварот, каб высеклі дрэва пад акном, трэба запісаць дзіця на чаргу ў садок, неабходна зарэгістраваць станцыю для зарадкі электрамабіляў — усё гэта адмінпрацэдуры. Атрыманне ліцэнзій, сертыфікатаў, пасведчанняў кіроўцы, даведак аб налічэнні пенсіі — таксама адмінпрацэдуры. Таму, чым больш такіх сэрвісаў і ўзаемадзеянняў будзе ў лічбавым эквіваленце, тым лепш, упэўнена Святлана Караневіч:

— Пералік адміністрацыйных працэдур рэгламентаваны заканадаўча: для фізічных асоб — Указам Прэзідэнта № 200, для юрыдычных (суб'ектаў гаспадарання) — пастановай Саўміна № 548. Усе дзеянні, прапісаныя ў згаданых дакументах, лічацца адмінпрацэдурамі. Усё, чаго ў іх няма, — электроннымі паслугамі. У лічбавым варыянце на адзіным партале з 307 электронных сэрвісаў 112 — гэта адмінпрацэдуры, астатнія — электронныя паслугі. Усяго ж у Беларусі звыш тысячы адмінпрацэдур, так што работа па іх алічбоўцы яшчэ вялікая.

Летась у Беларусі было аказана больш за 72,6 мільёна электронных паслуг, а сёлета толькі за 7 месяцаў — ужо звыш 70 мільёнаў, так што цікавасць да лічбавых паслуг у насельніцтва высокая, удакладніла прадстаўніца НЦЭП:

— Чым больш будзе цікавых і запатрабаваных паслуг на партале, тым вышэйшай будзе цікавасць насельніцтва да іх. Магчыма, некаторыя ўладальнікі ID-картак дагэтуль працягваюць прыходзіць па аказанне паслуг туды, куды прывыклі дагэтуль з папяровым пашпартам: на пошту, у банк, агенцтва нерухомасці... І яны нават не падазраюць, якія магчымасці цяпер ёсць у іх кішэні дзякуючы новаму дакументу, у тым ліку здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў і атрыманне паслуг не выходзячы з дому.

### ID-КАРТКА ЯК КВІТОК У ЛІЧБАВЫ СВЕТ

Адзіная сістэма ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб, якая рэалізавана на адзіным партале, дазваляе дакладна ўпэўніцца ў тым, хто ўвайшоў у сістэму, і верыфікаваць асобу ў інфармацыйных рэсурсах і сістэмах з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу. У Беларусі выпускаецца некалькі складана-тэхнічных прылад, якія ўтрымліваюць у сабе лічбавы подпіс. Гэта ключы ЭЛП на класічных носьбітах-флэшках, а таксама прылада eSign, якая рэалізавана на чыпе ID-карткі, расказаў **Ягор ВОРАНАЎ, намеснік дырэктара па інфармацыйных тэхналогіях НЦЭП**:

— У праграме пры персаналізацыі карткі асобы ствараецца ключ ЭЛП на ўвесь тэрмін дзеяння ID-карткі, іншымі словамі, на дзесяць гадоў. Атрымаўшы ID-картку, не трэба яе спецыяльна актываваць у нейкіх пабочных інфармацыйных сістэмах — яна ўжо валодае ўсімі функцыямі, якія закладваліся ў яе пры стварэнні дакумента. Атрымаўшы ID-картку, вы набываеце квіток на ўваход у лічбавы свет.

Мабільную праграму распрацавалі з улікам попыту і цікавасці грамадзян пры ўзаемадзеянні з дзяржорганамі і арганізацыямі, удакладніў спецыяліст НЦЭП:

— Прадукт дазваляе аўтарызавацца на партале з дапамогай ID-карткі. Для гэтага дастаткова прыкласці дакумент да тыльнага боку смартфона. Тэлефон пры гэтым павінен мець NFC-счытвальнік для ўзаемадзеяння з чыпам ID-карткі, каб атрымліваць з яе неабходную інфармацыю і аўтарызоўваць карыстальніка на партале.

### ДАВЕДКІ З ДЫСПАНСЕРА, МЫТНЫЯ ПАСАЖЫРСКІЯ ДЭКЛАРАЦЫІ

Сярод новых паслуг, якія з'явіліся на партале апошнім часам, — анкетаванне насельніцтва пры праходжанні ім дыспансерызацыі аднаго дня. Раз на год дыспансерызацыю, якая даступная шляхам анкетавання (анкету можна запоўніць самастойна ў асабістым кабінеце або падчас прыёму ва ўрача), павінен прайсці кожны пацыент.

— На падставе звестак з анкеты сістэма сама сфармулюе дакумент, дзе будзе ўказана, ці падвержаны чалавек рызыцы развіцця неінфекцыйных захворванняў сістэмы кровазвароту, анкалагічных хвароб, хранічных абструктыўных захворванняў лёгкіх і цукровага дыябету. А ўрач у залежнасці ад гэтага прызначыць лячэнне ці дадатковае абследаванне, — расказала Святлана Караневіч. — Гэтая анкета алічбавана і даступная ў асабістым электронным кабінеце грамадзяніна бясплатна. Запоўніць яе карысна найперш для самога чалавека, каб зразумець, якой рызыцы ён падвяргаецца ў залежнасці ад свайго ладу жыцця.

У будучыні плануецца з'яўленне паслугі па атрыманні лічбавых звестак з дыспансераў, куды шмат людзей звяртаецца па атрыманне правоў кіроўцы ці дазволу на рэгістрацыю права на нашэнне зброі. Цяпер спецыялісты цэнтра разам з Міністэрствам аховы здароўя вызначаюць, якія віды даведак могуць выдавацца ў электронным выглядзе, бо часта патрабуецца агляд з асабістай прысутнасцю чалавека.

Мяркуецца, што электронны выгляд атрымае і пасажырская мытная дэкларацыя — дакумент, які запаўняецца на граніцы, і ў якім указваецца бытавая тэхніка пасажыра, што ён правозіць.

— Пры наяўнасці лічбавага аналага дэкларацыю можна будзе запаўняць анлайн загадзя, мытная служба ў сваю чаргу хутчэй з ёй азнаёміцца, і ўсе мытныя працэдуры пройдуць хутчэй, — упэўнена Святлана Караневіч. — Паслугі на партале аказваюцца за грошы, за выключэннем выпадкаў, калі спажывец мае нарматыўна-прававы акт заканадаўчага ўзроўню (законы, указы і дэкрэты), які дазваляе атрымаць паслугу бясплатна. І мытны камітэт якраз плануе змяніць свае заканадаўчыя акты, каб паслугу запаўнення электроннай мытнай пасажырскай дэкларацыі можна было атрымліваць бясплатна.

Напісаць код для пераводу адмінпрацэдуры ў лічбу не так складана і доўга, значна больш часу займае арганізацыйны этап, калі трэба зразумець, якія дакументы можна выдаліць з працэсу аказання адмінпрацэдуры, каб спрасціць яе, за кошт чаго скараціць тэрмін яе аказання. І вельмі важна своечасова ўносіць змены ў нарматыўную базу, падкрэсліла Святлана Караневіч:

— Тэхналогіі часта бягуць наперадзе нарматыўнага рэгулявання. Ніводная лічбавая паслуга не можа быць уведзена ў прадукцыйнае асяроддзе, калі яна будзе супярэчыць заканадаўству. Напрыклад, пакуль МЗС не ўнясе змены ў візавыя правілы і нарматыўна не замацуе паняцце «электронная віза», не з'явіцца паслуга атрымання электроннай візы на ўезд у Беларусь, над якой працуе цэнтр.

Да канца 2023-га электроннымі мусяць стаць больш як 200 адмінпрацэдур, прыкладна 140 з якіх датычацца сферы зямельна-маёмасных стасункаў. Да 2025-га да сямейства лічбавых паслуг павінна дадацца амаль 450 сэрвісаў.

**Ірына СІДАРОК.**




# МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ З'ЯДНАНЫЯ СЛОВАМ

## Чаму ў выхадныя варта наведаць Гарадок

**Па добрай традыцыі ў першыя выхадныя верасня кнігавыдавецкую супольнасць і ўсіх шанавальнікаў беларускага слова і культуры будзе прымаць сталіца Дня беларускага пісьменства. Сёлета яе паўнамоцтвы ў Гарадка Віцебскай вобласці. Напярэдадні юбілейнага свята на сустрэчы з журналістамі арганізатары, прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, выдавецтваў, Саюза пісьменнікаў Беларусі распавялі пра тое, што ў гэтым годзе чакае ўдзельнікаў і гасцей.**





Фота БелТА.

Учора ад Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора ў Гарадок адправілася традыцыйная навукова-асветніцкая экспедыцыя “Дарога да святыняў”.

### АД «ДРЭВА ЖЫЦЦЯ» ДА «МАРЫ ГУРМАНА»

Гарадок заканчвае актыўную падрыхтоўку да свята. Як адзначыла **Марына НАВІЦКАЯ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта**, ужо ўстаноўліваюцца палатачныя павільёны, дзе размесцяцца выстаўкі. У горадзе з'явіліся скульптуры і скульптурныя кампазіцыі, якія сталі выкаваннямі маладых творцаў на такія тэмы, як «Спадчына», «Дрэва жыцця», «Надзея», «Летапісец» і многія іншыя. А адпраўным арт-аб'ектам будзе «Буквар», яго адкрыюць 2 верасня ў абноўленым Вераніцынскім скверы (пра ўсе гэтыя новыя аб'екты «Звязда» ўжо падрабязна пісала). Увогуле, на сёлетнім свяце пісьменства ўдзельнікаў чакае вельмі насычаная праграма: тут і прэзентацыі кніжных навінак ад выдавецтваў, праекты Беларускага саюза жанчын, кулінарны



праект «Мара гурмана» і шмат іншых цікавых прапаноў, каб адпачыць і прасякнуцца культурнай атмасферай. Горад чакае сваіх гасцей.

### У СВЯТА — ЮБІЛЕЙ

— У праграме XXX Дня беларускага пісьменства шмат мерапрыемстваў, якія, упэўнены, зацікавяць прыхільнікаў кнігі і проста людзей, якія жадаюць карысна правесці час у Гарадку. Асноўны акцэнт — гэта найперш юбілейная дата — 30-годдзе існавання Дня беларускага пісьменства. Дата, якая дазваляе рэзюмаваць вельмі сур'ёзны пласт работы самых розных галін: і пісьменнікаў, і кнігавыдаўцоў, і кнігараспаўсюджвальнікаў. І ў выніку мы можам зрабіць выснову, што ў нашай краіне кнізе надаецца ўвага не проста на словах, а робіцца вельмі шмат для гэтага і кіраўніком дзяржавы, і ўсімі структурамі, якія маюць дачыненне да пісьменніцкага слова, кнігавыдавецтва і распаўсюджвання кніг. Гэта 30 гадоў падтрымкі кнігі, ацэненыя на самых розных узроўнях, у тым ліку і на міжнародным. На той жа Мінскай міжнароднай выстаўцы-кірмашы, дзе збіраюцца таксама і прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, і пісьменнікі, і выдаўцы, і распаўсюджвальнікі кніг, усе падкрэсліваюць наша ўнікальнае стаўленне да кнігі. Гэта не пафас, а рэальныя ацэнкі. І трэба, каб яны прырасталі ў сілу таго, што мы хацелі б атрымліваць значна большыя рэйтынгі на ўзроўні міжнародных і гандлёвых пляцовак, — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Адна з дат, якую мы вылучаем прыярытэтнай у рамках Дня беларускага пісьменства, — 80-годдзе вызвалення Гарадка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Год міру і стваральнай працы для нас гэта дата з'яўляецца вельмі значнай. Яна знойдзе сваё адлюстраванне як у мерапрыемствах і канцэртных нумарах адкрыцця і закрыцця, так і ў шэрагу мерапрыемстваў, якія мы будзем праводзіць на розных пляцоўках. Сярод іх і вялікая колькасць комплексных праектаў, што рэалізоўваюцца праз нашы выдавецкія структуры. Спадзяюся, тое будзе не проста цікава, але з пункту гледжання карысці і выхавання акажа каласальнае значэнне і выкліча інтарэс у прысутных.

### «ЖЫВАЯ КЛАСІКА» І «ДАРОГА ДА СВЯТЫНЯЎ»

У праграме святкавання згадаюць вядомых асоб Віцебскай зямлі, не абмінуць увагай прыгожыя даты літаратараў, прэзентуюць шмат кніжных навінак, расчуляць і абудзяць жывым чытаннем твораў беларускай літаратуры. Апошняе штогод адбываецца ў рамках Рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка». Сёлета ён аб'яднаў у жаданні падзяліцца любімымі радкамі беларускіх класікаў 10 тысяч школьнікаў па ўсёй краіне. А на Дні беларускага пісьменства мы зможам атрымаць асалоду ад выступленняў фіналістаў творчага спаборніцтва. Слухаючы іх, дакладна стане зразумела, як можа гучаць любоў да мінулага сваёй зямлі, да роднага слова, калі робіцца тое з душой.

Трэба адзначыць, што Дзень беларускага пісьменства не абмяжоўваецца толькі мерапрыемствамі, што праходзяць у сталіцы свята. Так, напрыклад, 30 жніўня дадзены старт Рэспубліканскай навукова-практычнай асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў». За 30 гадоў правядзення яе ўдзельнікамі сталі 415 чалавек. А 1 верасня запланавана правядзенне традыцыйнага міжнароднага круглага стала. Аднак сёлета ён пройдзе ў сумяшчальным фармаце, бо Дзень беларускага пісьменства супадае з правядзеннем Маскоўскай кніжнай выстаўкі-кірмашу, дзе Беларусь будзе з'яўляцца ганаровым госцем. «Роля кнігі ў жыцці грамадства. Мінулае і сучаснасць» — так вызначана тэма дыялогавай пляцоўкі гэтага года. Яна дасць нагоду ўдзельнікам паразважаць, якой кніга была раней і як змяніўся яе статус з цягам часу, пад уплывам розных тэндэнцый. А таксама дазволіць праанлізаваць, якія творы з напісаных актуальныя да сёння і як упісваецца ў гэты кантэкст тое, што ствараецца пісьменнікамі цяпер.

### КАНЦЭРТ ЛІТАРАТАРАЎ І «СТУЖКА ЧАСУ»

На Фестывалі прэсы і кнігі будзе магчымасць пазнаёміцца з усёй разнастайнасцю перыядычных і кніжных выданняў, якія з'яўляюцца ў нашай краіне. Асаблівасцю мерапрыемства гэтага года стануць тэматычныя выстаўкі гарадоў-сталіц, дзе праходзіў Дзень беларускага пісьменства.

**«У нашай краіне кнізе надаецца ўвага не проста на словах, а робіцца вельмі шмат для гэтага і кіраўніком дзяржавы, і ўсімі структурамі, якія маюць дачыненне да пісьменніцкага слова, кнігавыдавецтва і распаўсюджвання кніг».**

— Нас чакае знакавае мерапрыемства ў асветніцтве і культуры нашай краіны. Тым больш што гэта XXX Дзень беларускага пісьменства. З аднаго боку, свята традыцыйнае, а з другога боку, па сутнасці, яно ўсё ж такі будзе новым і вельмі шматзначным, — зазначыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**. — Мы вельмі ўдзячныя, што ў праграме свята арганізатары асобна вылучылі пляцоўкі рэгіянальных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Нашы калегі — паэты, празаікі, драматургі, публіцысты з Мінска і вобласці і іншых абласцей — прыедуць разам з бібліятэкарамі і пакажуць палітру літаратуры, якая звязана з тым ці іншым рэгіёнам і з'яўляецца своеасаблівай творчай кніжнай справаздачай. Гэта будзе суправаджацца традыцыйным сцэнарыем, выступленнямі паэтаў, празаікаў, сустрэчамі з паэтамі-песеннікамі. Адметнасцю свята ўжо не першы год з'яўляецца канцэрт літаратараў, які праводзіцца на цэнтральнай пляцоўцы. І сёлета мы яго правядзём 3 верасня. Там нават прагучаць песні, спецыяльна напісаныя да Дня беларускага пісьменства і прысвечаныя Гарадку.

Не першы год існуе праект, які сёння называецца «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». Ён з'явіўся і існуе як вынік супрацоўніцтва Міністэрства інфармацыі і калекцыянера, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. Прыхільнікам праект вядомы шматлікімі мерапрыемствамі, выстаўкамі, кнігамі і альбомамі. І аккурат на Дні беларускага пісьменства Выдавецкі дом «Звязда» запрашае здзейсніць чарговую вандроўку ў мінулае з кнігай «Ад Віцебска да Полацка». З дапамогай паштовак, рэпрадукцый і іншых ілюстрацыйных матэрыялаў, змешчаных у выданні, можна апынуцца літаральна ва ўсіх рэгіёнах Віцебшчыны.

**У праграме святкавання згадаюць вядомых асоб Віцебскай зямлі, не абмінуць увагай прыгожыя даты літаратараў, прэзентуюць шмат кніжных навінак, расчуляць і абудзяць жывым чытаннем твораў беларускай літаратуры.**

Наведвальнікаў свята таксама чакае маштабная прэзентацыя вышэйзгаданага гісторыка-асветніцкага праекта «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». У адным месцы можна будзе і тэматычныя арт-аб'екты, і 50 кніг, якія выйшлі ў свет у рамках праекта, вечны каляндар і матэрыялы аўтара ў рэгіянальных і рэспубліканскіх друкаваных выданнях. Не абыдзецца і без прыгожага працягу. На свяце праект прэзентуе свой сімвал «Стужка часу Бацькаўшчыны», стылізаваны ў выглядзе сучасных сімвалаў Беларусі і ўпрыгожаны традыцыйнымі ўзорамі беларускага арнаменту, якія спалучаюць мінулае, сучаснасць і будучыню. Стужка будзе асвечана, і яе атрымаюць усе наведвальнікі павільёна, дзе прадставяць праект.

Падчас трэніровак пад кантролем трэнераў клуба забівалі галы, перадавалі пасы, адпрацоўвалі прыёмы спачатку малодшыя футбалісты, затым старэйшыя. Але без справы не сядзеў ніхто. Арганізатары пастараліся задаволіць усе інтарэсы сучасных дзяцей. Побач з футбольным полем размясцілася TikTok-арэна. Цікава, што захапляе сучасных дзяцей больш: футбол або TikTok? Аказалася, іх максімальна захапляе футбол у TikTok. На TikTok-арэне дзеці (ды і некаторыя дарослыя) з задавальненнем удзельнічалі ў футбольных чэленджах, здымалі ролікі, уважліва слухалі футбольных блогераў. Усе відэа, апублікаваныя ў сацыяльных сетках пад хэштэгам #A1JChallenge, удзельнічалі ў конкурсе «А1 Юніёр». Ролікі, якія набралі больш за ўсё праглядаў, трансліраваліся на вялікім экране на стадыёне. Аўтары трох найлепшых атрымалі прызы.

Якое футбольнае свята без турніру? Праверыць свае здольнасці ахвотныя маглі ў турніры FIFA на вялікім экране, у распараджэнні ўдзельнікаў свята быў і VR-футбол. Для аматараў рэальных, а не віртуальных забавак — таксама конкурсы. Прычым незвычайныя. Напрыклад, футбольны дартс па знаёмых правілах, толькі замест дроцікаў — футбольны мяч. А як наконт забіць мяч, калі на нагах валёнкі ці гумовыя боты? Не абышлося і без танцаў — самыя энергічныя правяралі свае сілы ў турніры па Just Dance.

Заняткі футбольнага клуба «А1 Юніёр» праходзяць у Мінску на базе спартыўных установ і ўстаноў адукацыі, размеркаваных па ўсім горадзе. Бацькі могуць выбраць лакацыю, зручную і ім, і дзецям. Але нават гэта не вырашальны фактар для выбару менавіта гэтага клуба. Галоўнае — адносіны трэнераў да дзяцей. На гэта звярнуў увагу Андрэй Бакавец. Яго сыны Арцём і Саша займаюцца ў «А1 Юніёр» ужо не першы год. «А1 Юніёр» падкупіў мяне адносінамі трэнераў да дзяцей і насычанай спартыўнай праграмай. Старэйшы сын займаецца з задавальненнем, ну а ў малодшага ўжо не было выбару. Клуб — гэта вялікая спартыўная сям'я. Таты таксама аб'ядналіся ў футбольную каманду. Мы пасябравалі, разам ходзім у паходы, ладзім мерапрыемствы. Я не ведаю, вырастуць мае дзеці прафесійным футбалістамі ці не, хоць такія мары, вядома, ёсць. Для нас, бацькоў, галоўнае не спартыўныя вынікі, а задавальненне дзяцей», — дзяліцца Андрэй.

Групы ў клубе фарміруюцца не толькі па ўзросце, але і па ўзроўні падрыхтоўкі. Трэнеры стараюцца знайсці індывідуальны падыход да кожнага маленькага спартсмена, эфектыўна развіць яго моцныя бакі. Каб пасля Дня адкрытых дзвярэй канчаткова зрабіць выбар на карысць «А1 Юніёр», можна таксама запісацца на бясплатную пробную трэніроўку.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**

УНП 190919521

# Турнір, які не мае аналагаў

**У канцы жніўня Лядовы палац Маладзечна прымаў гасцей. Хакеісты ва ўзросце да 12 гадоў паспрабавалі свае сілы ў чатырох дысцыплінах: хакеі, баскетболе, міні-футболе і эстафетным плаванні. Турнір па мнагаборстве сярод дзіцячых хакейных камандаў прайшоў ужо чацвёрты год запар. Гэтым разам у ім выступалі выхаванцы мінскага «Дынама-Джуніверс», салігорскага «Шахцёра», ДЮСШ хакейнага клуба «Гомель», аршанскага «Лакаматыва», ДЮСШ хакейнага клуба «Бабруйск» і маладзечанскага «Дынама». Пераможца вызначаўся па найменшай суме занятых месцаў у спаборніцтвах у кожным з чатырох відаў спорту. Першае месца ў выніку занялі гаспадары — хлопцы з «Дынама-Маладзечна».**

«Галоўная мэта — гадаваць гарманічна развітых хакеістаў, — распавёў **старшыня Федэрацыі хакея Беларусі Аляксандр БАГДАНОВІЧ.** — Такія мультыспартыўныя турніры дазваляюць дзецям праявіць сябе не толькі ў хакеі, дзе ўсё ўжо знаёмае, але і ў іншых відах спорту. Прыемна, што гэты сусветны вопыт пераймаюць у нашых рэгіёнах, і сёння мы з вамі адкрываем такі класны турнір у Маладзечне. Жадаю ўсім камандам поспеху і, вядома ж, абысціся без траўмаў, бо старт сезона ўжо зусім хутка!»

У першы дзень спаборніцтваў на лядовай арэне сустрэліся каманды «Дынама-Джуніверс» і маладзечанскага «Дынама». У выніку жорсткай барацьбы з лікам 3:2 перамога засталася за гаспадарамі арэны.

«Дзецям падабаецца, бо тут прадстаўлены даволі цікавыя гульнявыя віды спорту, — адзначыў **трэнер каманды «Дынама-Маладзечна» 2011 года Аляксандр ГРЭКОВІЧ.** — Гэта, вядома, і хакей, і футбол, і баскетбол, і плаванне. Уся наша каманда атрымлівае задавальненне. Важна, што ёсць магчымасць пазаймацца на стадыёне і на плоскасных збудаваннях. Гульнявыя віды спорту самі па сабе дзецям лёгка даюцца. Бываюць і дастойныя пройгрышы, але перамагаць заўсёды прыемна. Гуляць у хатнім турніры добра, бо тут адчуваецца падтрымка трыбун і гледачоў».





**Гулец каманды «Дынама-Маладзечна» 2011 года Сцяпан ШАРАНГОВІЧ** падзяліўся ўражаннямі ад перамогі: «Каманда не патрабуе ад мяне вялікай колькасці галоў. Я сам ад сябе патрабую — павінен забіваць, і амаль на ўсіх гульнях раблю гэта. Цяжкіх матчаў не бывае, ёсць толькі матчы, у якіх мы павінны перамагаць і выйграваць. У мяне было дзве шайбы, я проста абыграў саперніка і спакойна забіў, нават не напружваючыся». Па словах спартсмена, ён ужо не першы раз удзельнічае ў турніры. «Добра гуляць пры сваіх балельшчыках і групе падтрымкі. Нам становіцца лягчэй перамагаць. І турнір сам па сабе атрымаўся вельмі добры. У іншых відах спорту спаборнічаць сапраўды гэтак жа, як і ў хакеі. Важна нідзе не прайграваць, а толькі перамагаць. Мне падабаюцца ўсе віды спорту, але з пералічаных — самы любімы ўсё ж такі хакей».

«З задавальненнем трэніраю ўсіх, але цяпер адказваю за набор 2017 года, — расказаў **трэнер каманды «Дынама-Джуніверс» Яўген ЛЯВОНАЎ.** — Гэтым разам мы прыехалі другім саставам «Дынама» 2012 года на турнір. Я часта выходжу дапамагаць з гэтымі хлопцамі галоўнаму трэнеру, добра ведаю ўсіх. Задача ў нас заўсёды адна — выходзіць і перамагаць». На думку трэнера, няпрофільныя віды спорту — гэта ўсё адна і тая ж гульня. У футболе і баскетболе ўсё пераносіцца з лядовай пляцоўкі на футбольную і баскетбольную.

«Дзеці павінны гуляць ва ўсе, гэта значыць калі ты гуляеш у футбол ці баскетбол, то і ў хакей згуляеш. Важнае разуменне самой гульні: дзе адкрыцца, дзе закрыцца, а дзе змяніцца. Усе нашы хлопцы ведаюць, што трэба рабіць. У сваю чаргу, лішні раз толькі карэкцырую і накіроўваю іх».

«Рыхтаваліся да турніру, настрой у камандзе быў добры, але, на жаль, сёння прайгралі, — рэзюмаваў **гулец каманды «Дынама-Джуніверс» Леў ГАЎРЫЛОВІЧ.** — Таксама спаборнічалі з «Дынама-Маладзечна» ў футболе, але прайгралі з лікам 3:1. Паспелі яшчэ згуляць у футбол супраць салігорскага «Шахцёра».

У апошні дзень спаборніцтваў па выніках плавальнай эстафеты вызначылася выніковае размяшчэнне камандаў у мнагаборстве. Перамаглі гаспадары спаборніцтваў — юныя хакеісты «Дынама-Маладзечна». У тройку прызёраў увайшлі таксама хлопцы з Гомеля і мінскага «Дынама-Джуніверс».

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**
*г. Маладзечна.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Оператор ЭТП | **«Единая система электронных торгов»** |
| Продавец | **Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»** |
| Предмет электронных торгов | |
| **Лот № 1: грузопассажирский вагон (WAGON) GAZ-2752,** инвентарный номер № 3198р (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 548,04 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %. Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский район, промзона Михалки Мозырь-11 | |
| **Лот № 2: автомобиль VOLKSWAGEN TRANSPORTER,** инвентарный номер № 2241 (по бух. учету), год выпуска – 1999, начальная цена – 551,90 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %. Местонахождение: г. Гомель, ул. Проселочная, 16А | |
| **Лот № 3: грузовой специальный MAZ 533702-204 КО-529-08,** инвентарный номер № 1632К (по бух. учету), год выпуска – 2004, начальная цена – 1506,71 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %. Местонахождение: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 187 | |
| **Лот № 4: автомобиль SKODA OCTAVIA,** инвентарный номер № 655 (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 8 400,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %. Местонахождение: Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9Д | |

**Размер шага составляет 5 %** от начальной цены лота (по всем лотам).

**Задаток 100 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», р/с: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ, УНП: 190318109, ОКПО: 37533622, БИК BELBBY2X.

**Срок подписания договора купли-продажи: в течение 20 (двадцати)** календарных дней после электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Продавцу затраты на организацию и проведение электронных торгов в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи.

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», по электронному адресу: www.torgi.gov.by.**

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 02.10.2023 с 9.00 до 02.10.2023 16.00.**

**Дата и время окончания приема заявок:** по 29.09.2023 до 16.00 по адресу: www.torgi.gov.by.

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайте: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА».**

**Контактные данные:** +375 (17) 200-73-33, +375 (17) 200-64-11, +375 (29) 249 56 43 (Продавец).

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**
по продаже имущества **ОАО «Ритм» (продавец)**
в лице управляющего в деле о банкротстве
Насонова В.В. извещает о проведении
**14 сентября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением на 99,1 %**
в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 31.08.2023 по 13.09.2023 с 9.00 до 16.00.
Подробный перечень имущества в количестве 1 лота, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 22.10.2022 г. № 208 (29830).
Контактные данные: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

УНП 400071204

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению открытого акционерного общества
«Узденский райагросервис» (продавец)
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ СТОЛОВОЙ

**с инв. № 623/С-57842 общей площадью 83,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625684211601000157 площадью 0,0467 га** *(право аренды по 2110)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Узденский с/с, д. Тычинки, ул. Молодежная, 19а.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 6 120,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **612,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **04.10.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.10.2023** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01718) 68-6-73, 8 (029) 936-28-18.**

УНП 600000330

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»

Аукцион состоится **15.09.2023 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Лот № 1:**

**капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная**, пл. – 687,6 кв. м;
**капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м;
**капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, пл. – 44,2 кв. м;
**емкость металлическая 80 м³**, инв. № 5283.

Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского,64, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота №1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 79 020,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 7 902,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 14.09.2023 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by. Доп. информацию можно получить **по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов: лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Комсомольская, 11А** | **Начальная цена с НДС 20 %** |
| **Здание банка** (здание специализированное финансового назначения) общей площадью 1 495 кв. м, инвентарный номер 240/С-13688. Составные части и принадлежности: тамбур, подвал, чердак, гараж. **Обременение:** аренда. Подробная информация у Продавца | **557 224,70 бел. руб.** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 242400000001000572:** назначение – для Оршанского отделения «Белпромстройбанка», предоставлен на праве постоянного пользования, общая площадь 0,0462 га | |
| **Лот № 2 – капитальное строение, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Ленинская, 2** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
| **Здание банка** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 2479 кв. м, инвентарный номер 330/С-11218. Составные части и принадлежности: подвал, крыльцо. **Обременение:** аренда. Подробная информация у Продавца | **1 236 452,40** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 341500000001000141:** назначение – строительство и обслуживание здания отделения ОАО «Белпромстройбанк», предоставлен на праве постоянного пользования, общая площадь 0,1636 га | |
| **Дополнительная информация по лотам №№ 1, 2:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона: по лоту № 1 на сумму **6 311,99 бел. руб**., по лоту № 2 на сумму **11 691,39 бел. руб.** Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB 30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от цены продажи лотов №№ 1, 2 | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении электронных торгов по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 05.08.2023 г., по лоту № 2 от 25.07.2023 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: 10.00 **22.09.2023.** Окончание торгов: 12.00 **22.09.2023**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.09.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 13 сентября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2-9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи с НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 2 | **Автомобиль грузовой специальный фургон изотермический MAZ 4371 АФИК,** регистрационный знак АЕ 6057-3 с инв. № 504340001, VIN Y39437100F0007199, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Речицкий, 9А. Автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Требуется капитальный ремонт двигателя, коробка передач требует ремонта, тормозные диски и колодки изношены, коррозия на кабине, дверях и капоте, имеется прогиб внутренней обшивки крыши, коррозия днища. Пробег 560631 км | **6 414,79** | 641,48 |

**Продавец:** Гомельский филиал РУП «Белпочта», 246048, г. Гомель-48, ул. Советская, 8.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (0232) 29-38-97, Щеглов Сергей Николаевич.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 августа 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 11 сентября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5** % (далее – Претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **5 (пяти) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи за исключением оплаты стоимости приобретенного имущества в рассрочку. Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется по письменному заявлению Победителя аукциона (Претендента на покупку) в соответствии с законодательством. Имущество, проданное с рассрочкой оплаты, находится в залоге у Продавца для обеспечения исполненной Покупателем обязанности по оплате его цены в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Передача имущества Покупателю будет осуществляться после полной оплаты цены продажи объекта. Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности».

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества».

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.07.2023 г. № 142 (30022). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Аукцион состоится **20.09.2023 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Лот № 1:**

**изолированное помещение с инв. № 700/D-85447 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл. 1478,4 кв. м;
**изолированное помещение с инв. № 700/D-85854 – изолированное помещение образовательного, воспитательного и научного назначения**, общ. пл. 744,9 кв. м;
**изолированное помещение с инв. № 700/D-85857 – бомбоубежище**, общ. пл. 184,9 кв. м;
**изолированное помещение с инв. № 700/D-85450 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл 42,3 кв. м.

Обременение: аренда. Лот №1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3; 3-2, на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000531 (площадь – 1,0722 га, право аренды, доля в праве 49/250). Отдельный земельный участок для обслуживания лота №1 не выделен.

**Начальная цена продажи: 950 817,58 бел. руб. с учетом НДС. Размер задатка 95 081,76 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

Доп. информацию можно получить **по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

Перажытае

# МАЕ ЛЮБІМЫЯ «ЧЫТАНКІ»

***Мы працягваем друкаваць успаміны ветэрана айчыннай журналістыкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, былога супрацоўніка «Звязды» Міхаіла ШЫМАНСКАГА. Ён — дзіця вайны, узнаўляючы са сваімі бацькамі, іншымі жыхарамі роднай вёскі Пешкі Бярозаўскага раёна многія падзеі, распавядае пра перажытае і незабытае ў час нямецкай акупацыі. Нам усім неабходна берагчы гістарычную памяць, каб не паўтарылася страшнае.***

**Усю вайну, дзе б ні была наша вялікая сям'я, мяне ніколі не пакідала цікавасць да кніг. Заўсёды, калі заходзіў у чыюсьці пешкаўскую хату, ці ў суседняй вёсцы Боркі, ці на хутары Буда, перш-наперш «шнарыў» вачыма па сценах, па лаўках, па стале — мо ўбачу кнігу. Такая мая апантанасць у лепшым сэнсе гэтага слова мела рэальную аснову: маці навучыла мяне чытаць у чатырохгадовым узросце. І часта потым успамінала, як не даваў ёй спакою, прасіў дастаць хоць якую-небудзь «чытанку». Некаторыя гісторыі з ваеннага часу — пра гэтае маё захапленне.**



## НЯДОЎГАЯ РАДАСЦЬ

Памятаю, як у Будзе мне аднойчы пашчасціла: нечакана ў адной хаце ўбачыў некалькі кніг. «Дайце мне хоць адну пачытаць, — ледзь не малюся. — Не згублю кнігу, прынясу вам назад».

Гаспадары даюць мне не адну, а дзве. Я бягу да Ладзіхінай хаты, радасна крычу маці:

— Вось кнігі мне далі ажно дзве. Пачытаем разам.

Потым маці ўспамінала:

— На жаль, сыночак, твая радасць тады адразу ж прайшла. Адна кніга была на польскай мове, другая — на рускай. Па-польску ты чытаць не ўмеў. Ну а руская была занадта сур'ёзная, зусім не для тваго ўзросту. І ніводнага малюнка. Мо два ці тры дні ты іх гартаў, гэта таксама давала табе задавальненне, а потым аддаў гаспадарам. Вельмі шкадаваў, што так і не змог прачытаць. І ўсё пра тыя кнігі, якія чытаў раней, успамінаў. Ну, калі яшчэ нашу хату праклятыя немцы не спалілі...

## ХАЛОДНАЙ ЗІМОВАЙ РАНІЦАЙ

А было так. У пачатку вайны наш бацька прынёс з Броннай Гары паўмеха розных кніг. І тут для мяне наступіла зусім новае жыццё, якое поўнасцю мяне захапіла. Узнаўлю зараз найбольш важныя моманты — паводле ўспамінаў маці і асабіста маіх.

...Халодная зімовая раніца. У нашай хаце няўтульна і маркотна. Маці абірае бульбу, каб зварыць на снядана, а я сяджу за сталом над кнігай. На стале ледзь чадзіць лампа, бо моцна ўкручаны кнот: вельмі ж беражом газу. Я ўтаропіўся ў кнігу, чытаю марудна, ледзь перабіраючы губамі. Кніга на рускай мове, я не паспеў яшчэ вывучыць усе літары. І часта прашу маці, каб падсказала мне тую літару, якую не ведаю. Маці зусім не злуецца, наадварот, ахвотна мне памагае, усяляк падтрымлівае мой інтарэс да чытання. І радуецца, што гэты інтарэс усё больш і больш ахоплівае мяне.

Чамусьці доўга не магу запомніць рускую літару «и». Нават і цяпер, праз столькі гадоў, памятаю, як цяжка давалася мне гэтая «и», і я па-свойму злаваўся на яе за такое «непаслухмянства». А гэтых «и» ў рускай мове — большасць.

## Я «СПАТЫКНУЎСЯ» НА ЛІТАРЫ «И»

У хату заходзіць па нейкіх справах дзядзька Васіль, родны брат нашай маці.

— Чаму не спіш? — пытаецца і здзіўлена глядзіць на мяне.

— Ды вось, прачнуўся разам са мною — і адразу за кнігу, — гаворыць маці.

— Усё чытаеш і чытаеш, — працягвае дзядзька. — Хто ведае, добра гэта ці толькі вочы свае псуеш з дзяцінства. А ці зможаш, калі станеш дарослым, жыць з кніг? Ніхто табе не скажа, бо ніводнага такога чалавека цяпер у Пешках няма. Можа, у цябе нешта і атрымаецца. Ну, ладна, пачытай зараз мне ўголас. Паслухаю, як у цябе выходзіць.

Я ў поўнай разгубленасці. Упершыню з такой просьбай да мяне звяртаецца не маці, а хоць і свой, ды ўсё ж іншы чалавек. Пачынаю чытаць, вельмі стараюся, але ж атрымліваецца горш, чым калі чытаю маці.

А тут — слова з «и»: намагаюся ўспомніць, як называецца гэтая літара. Дарэмна. Расхваляваўся, усё вылецела з маёй галавы. Змоўк у поўнай роспачы.

— Ну, вось, зноў ты спаткнуўся на гэтай літары, — спяшаецца маці ад печы мне на дапамогу. — «І» яна называецца, «і»...

Я, шчыра ўдзячны маці і каб дагадзіць дзядзьку Васілю, працягваю чытаць далей. Дзякуй маці, з літарай «и» ўсё ў парадку. Але хутка на ёй «запнуўся». І па той прычыне, што на старонку кнігі ледзь падала зусім слабенькае святло лямпы.

— Ты ж малайчына, — нечакана кажа дзядзька Васіль і гладзіць мяне па галаве. — У кніжцы многа розных літар, а ты не ведаеш толькі адну. Чытай-чытай, хлопча, можа, і выйдзе з цябе добры грамацей...

Дзядзька павярнуўся ад стала, патупаў да дзвярэй — яму трэба было нешта абмеркаваць з нашым бацькам, які корпаўся ў клуні. А я ледзь не заплакаў: у адказны момант зноў падвяла мяне тая самая «и». Выцер слёзы і пры слабым святле лямпы «ўтаропіўся» ў кнігу. Спаць мне зусім не хацелася...

## У МАЦІ — ТАЛЕНТ ПЕДАГОГА

Паволі, але настойліва і цярпліва, з пачуццём глыбокага хвалявання, здзіўлення і радасці ўваходзіў я ў цудоўны свет кнігі. Ужо тады, яшчэ зусім малы, я адчуваў: кніга для маёй душы, розуму. Калі падрос і пайшоў служыць у армію, пераконваўся ў галоўным: кніга — гэта ўсебаковае пазнанне самой чалавечай існасці, гісторыі развіцця грамадства, усяго, чым багатае, цікавае і часта вельмі няпростае наша жыццё.

Ужо потым, калі вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце, працаваў у рэдакцыі «Звязды», прачытаў і занатаваў у сваім дзённіку словы вядомага савецкага педагога Васіля Сухамлінскага, якія ўзрушылі мяне да глыбіні душы. Вось яны: «Адной з ісцін маёй педагагічнай веры з'яўляецца бязмежная вера ў выхаваўчую сілу кнігі. Школа — гэта перш за ўсё словы, кніга, жывыя чалавечыя адносіны. Кніга — гэта магутная зброя. Разумная, натхнёная кніга нярэдка вырашае лёс чалавека».

Тады, да вайны, усе нашы пешкаўцы ведалі, як хутка і добра маці навучыла мяне чытаць. Успамінаю цяпер тыя матчыны ўрокі, мы іх называлі «чытанкамі», і думаю: быў у нашай маці талент педагога. Мо на тое воля і сіла Усявышняга. Бо маці не толькі па кніжках вучыла мяне чытаць. Свае «ўрокі» яна арганічна спалучала з песнямі — іх маці чула і запомніла назаўсёды, калі ў Першую сусветную вайну апынулася ў бежанцах пад далёкім рускім горадам Царыцынам. А матчыны песні для кожнага дзіцяці, нават падлетка — гэта пачуццё, эмоцыі, хваляванні. Менавіта тое, што ўзрушае нашу душу і застаецца ў ёй, каб усё жыццё адгукацца і адгукацца.

## ДЗІВОСНЫ СВЕТ ПАЭЗІІ

«Маміны» вершы — незвычайна хвалюючая з'ява ў маім дзяцінстве, якая ў памяці назаўсёды. Гэта асобная тэма. Зараз коратка толькі пра адзін выпадак. Часцей за ўсё маці чытала мне шырока вядомы верш Мікалая Някрасава, прысвечаны Міхаілу Ланоносаву. Памятаецца: «Скоро, сам узнаешь в школе, // Как архангельский мужик, // По своей и Божей воле // Стал разумен и велик» . Мне так падабаўся гэты верш, што ведаў яго на памяць і чытаў вельмі часта — услых, а то і проста сам пра сябе.

Верасень 1945 года. Увясну ў Борках адчынілася пачатковая школа: чатыры класы ў хаце дзядзькі Барыса. На першым школьным уроку настаўніца прапанаўвае вучням расказаць хто што хоча. Ну, самае цікавае, што ўжо адбылося ў нашым жыцці. Я чытаю той самы верш Някрасава пра Ламаносава. Ды так здорава, без адзінай запінкі, што настаўніца мяне хваліць. І пытаецца, ці ведаю, хто напісаў такі цудоўны верш. «Гэта мамін верш», — адказваю. «Няхай пакуль будзе так», — усміхнулася настаўніца.

Праз творы Някрасава, Пушкіна, Лермантава ці, як тады гаварыў, «маміны вершы», я прыйшоў у дзівосны свет нашай беларускай паэзіі. Яна поўнасцю захапіла мяне на ўсё жыццё, і тым шчаслівы. Бясконца люблю і захапляюся Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, Аркадзем Куляшовым, Пятрусём Броўкам, Піменам Панчанкам, Максімам Танкам.

## ПРА ЯКУБА КОЛАСА Ў ЕГІПЦЕ

І ўсё ж найперш — Якуб Колас. Пэўна, лёсам наканавана: многія вельмі цікавыя і важныя для мяне падзеі звязаны з імем нашага славутага песняра. Гэта адбываецца на працягу ўсяго майго жыцця. Падчас службы на Поўначы, у Савецкай Арміі. Калі чвэрць стагоддзя працаваў карэспандэнтам самай папулярнай у Савецкім Саюзе газеты «Известия». Яшчэ ў час майго падарожжа па Прыпяці, калі пабываў у хаце дзеда Талаша, сустрэўся з яго сынам і паспеў запісаць усё, што ён мне расказаў.

Пры маіх вандроўках па Кітаі і Егіпце, калі сярод экзотыкі я распавядаў гідам пра не менш цікавую экзотыку нашага Палесся і як яе вобразна апісаў Якуб Колас. Гід — перакладчык нашай групы Амір, у свой час вучыўся ў Маскве, дасканала валодаў рускай моваю, слухаў мяне і захапляўся:

— Гэта ж у вашай Беларусі столькі лясоў. І мноства рэк і азёр. І так часта ідуць дажджы! Як жа ў вас здорава, калі ўсюды зелена, і якое натхненне было ў паэта Якуба Коласа ад такой прыгажосці!

## «О, КРАЙ РОДНЫ...»

Відаць, я змог тады хоць крыху перадаць цудоўную вобразнасць коласаўскай паэзіі, калі так узрушыўся Амір. Ды кожная лірычная душа адгукнецца трапяткім хваляваннем на глыбока пранікнёныя радкі з паэмы «Сымон-музыка»:

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей на свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць.*

Прабачце, шаноўныя чытачы, але скажу пра вельмі асабістае, звязанае з імем Якуба Коласа. Яшчэ ў 1952 годзе, калі вучыўся ў восьмым класе, рэспубліканская газета «Піянер Беларусі» надрукавала мой верш, прысвечаны 70-годдзю нашага песняра. Публікацыя мела такое хвалюючае для мяне значэнне, што хацелася б вярнуцца да яе. І тут не толькі маё асабістае. Многія пакаленні беларусаў, асабліва вяскоўцаў, раслі і выхоўваліся на багатай творчасці Якуба Коласа, напоўненай глыбокім гуманізмам, хваляваннем, пачуццём бязмежнай любові, шчырай адданасці нашай мілай Беларусі. Яна фарміравала і фарміруе цяпер характар і асобу сапраўднага грамадзяніна, патрыёта сваёй радзімы. Як гэта важна, жыццёва неабходна ў наш тлумны, небяспечны час.

## ДАРАГІ ЎСПАМІН

Напрыканцы гэтага аповеду зноў вярнуся да «чытанак». Заўсёды, калі раней з Мінска прыязджаў у свае Пешкі, абавязкова сустракаўся з дзядзькам Васілём. Падоўгу сядзелі разам за сталом, дзядзька выпытваў у мяне, як жывецца ў самай сталіцы. Уважліва мяне слухаў і глядзеў на былога паўгаладнага і худога хлопчыка з пачуццём свайго асабістага задавальнення і нават гонару.

— Усё ж такі, Міша, кнігі вывелі цябе ў свет, — разважаў дзядзька. — А я і верыў у гэта. Помніш зімовыя «чытанкі»?

— А як жа. Іх нельга забыць.

— І я помню. Я цябе яшчэ тады хваліў, што з мноства літар ты доўга не мог вывучыць толькі адну. Гэта ж трэба — усяго адну. Вось бы мне твае здольнасці.

Мы абодва смяёмся, нетаропка абедаем. Настрой у нас цудоўны, бо на стале не толькі смачныя вясковыя ласункі... Але і самыя дарагія ўспаміны пра мае любімыя «чытанкі»...

# «СВЕТ СПАЗНАЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ НАВУКОВЫМІ МЕТАДАМІ, АЛЕ І ПРАЗ МАСТАЦКІ ВОБРАЗ...»

## Вялікая гутарка з Аляксандрам РАДЗЬКОВЫМ

*(Заканчэнне.
Пачатак у нумары
за 29 жніўня і 30 жніўня)*

***— У вашым творчым багажы цяпер ёсць незвычайная кніга — «Маленькія гісторыі вялікай сям'і», напісаная сумесна з вашай дачкой, паэтэсай Наталляй Ігнаценка. Цікава, як ішла праца над адборам матэрыялу, бо ён жа вельмі шчыры, тычыцца сямейнага жыцця — ці ўзнікалі спрэчкі, што выносіць на паказ чытачу, што не?***

— Аповеды аб сваёй сям'і толькі знешне выглядаюць як тэма зразумелая і цікавая для шырокай чытацкай аўдыторыі. Сапраўды, кожная сям'я мае сваю гісторыю. А беларускія сем'і прайшлі праз гады сацыяльных узрушэнняў, крывавых войн, выжывання ў найцяжэйшых эканамічных умовах. Але было і захапленне ад вялікіх перамог, радасць ад мірнага жыцця, якое наладжваецца, гонар ад росквіту ў апошнія гады незалежнай беларускай дзяржавы. Колькі сямейных гісторый! Так і хочацца напісаць пра подзвігі, дасягненні, перажыванні, трагедыі сваіх блізкіх. Яны ж усе заслугоўваюць памяці пра сябе. Вось тут якраз і ўзнікае праблема. Сямейнае апавяданне цікава найперш самым блізкім, а ці захопіць яно шырокае кола чытачоў — вялікае пытанне. Ды і колькасць гісторый пра сваіх родных толькі спачатку здаецца невычэрпнай. Варта ўзяцца за іх пісьмовы пераказ, і яны тут жа заканчваюцца. Ды і пісаць трэба ўмець.

**«Развіваючы ідэю адукацыйна-патрыятычнага выхавання школьнікаў і студэнтаў, мы вырашылі арганізаваць сістэмныя экскурсіі па краіне, акрэсліўшы сем асноўных памятных мясцін, якія абавязаны наведаць кожны беларус. Па адным у кожным рэгіёне. Але ж да знакавых мясцін трэба аднесці не толькі старажытныя гістарычныя, прыродныя і культурныя помнікі, але і сучасныя вытворчасці, якімі мы славімся ва ўсім свеце. Паспрабавалі спачатку вызначыць гэтыя мясціны. І адразу сутыкнуліся з непераадольнымі цяжкасцямі. Такіх аб'ектаў аказалася значна больш, і выбар з іх сямі найважнейшых пагражаў ператварыцца ў гарачыя і бясконцыя спрэчкі».**

У нашай вялікай сям'і апавяданні адзін пра аднаго смакавалі. Людзі адукаваныя, з добрым гумарам, многія па працы маюць зносіны з шырокім колам цікавых людзей — заўсёды ёсць пра што пагаварыць. Відавочна вылучаліся і выбітныя апавядальнікі, найперш наш старэйшы брат Уладзімір — сваімі афарыстычнымі выказваннямі і малодшы брат Мікалай — адметным народным гумарам. Прывяду ў якасці прыкладу аповед аб тым, як Мікалай, які жыў больш заможна, чарговы раз памяняў сваю легкавую машыну. Малодшы брат Віктар машыну ў той час купіць сабе ўвогуле ніяк яшчэ не мог. І адразу ж пасля пакупкі Мікалай тэлефануе Віктару:

— Віцька, я сабе машыну новую купіў! Ты рады?

Я смакаваў падобныя гісторыі, але не запісваў. Проста было не да гэтага. Займаўся навуковай працай, выкладаў ва ўніверсітэце, займаўся сваімі дзецьмі. Але паступова стаў заўважаць, што такія гісторыі прыкмячае і пераказвае мая старэйшая дачка Наталля. У яе яшчэ атрымліваліся вершы. Дарэчы, першыя былі напісаны якраз на сямейныя тэмы. З часам Наталля стала выдаваць зборнікі сваіх вершаў, потым напісала некалькі кніг для дзяцей, набыла як пісьменніца пэўную вядомасць і заўсёды ў сямейным коле дзялілася сваімі назіраннямі аб жыцці членаў нашай усё большай сям'і. У яе трактоўцы гэтыя гісторыі ігралі своеасаблівымі фарбамі, былі па-мастацку аформленыя і эфектна пададзеныя. І я пачаў яе падштурхоўваць да іх выдання ў выглядзе кнігі. Наташа доўга супраціўлялася. Яна, як ужо дастаткова вопытны пісьменнік, разумела, што такое выданне прадугледжвае нейкі арыгінальны падыход. Інакш кніга не выкліча ў чытачоў цікавасці. Сямейныя гісторыі ёсць ва ўсіх, прычым свае загадзя цікавейшыя за іншых.



Нам цяпер цяжка сказаць, каму першапачаткова прыйшла ў галаву гэтая думка, але мы вырашылі пісаць такую кнігу разам. Бацька і дачка, мужчынскі і жаночы падыход, розныя пакаленні, строгі дзелавы і мастацкі стыль выказвання, розны погляд на адны і тыя ж падзеі, мы нават папрасілі выдавецтва нас набраць розным шрыфтам. Думаю, што шмат у чым гэтая кніга нарадзілася дзякуючы старэйшаму сыну Наталлі, майму ўнуку Паўлу. Дзякуючы яму мы адчулі неверагодныя магчымасці новых інфармацыйных тэхналогій. Павел настроіў камп'ютарную праграму, якая дазволіла нам пісаць адначасова. Я бачыў, што піша Наташа, а яна — што ў дадзены момант я. І гэта пры тым, што я працаваў у Мінску, а яна — у Маскве.

Дзіўнае захапленне творчасцю! Здаралася, мы ўдваіх ляцелі — смакавалі гісторыі, апісвалі характары, успаміналі ўсё новыя і новыя здарэнні. А бывала, што сварыліся, рэзка разыходзіліся ў ацэнках і падыходах у выкладанні матэрыялу. Спыняліся, здавалася, што ўжо не вернемся да гэтай працы. Але яна ўжо нас заняволіла. Праходзіў час, і мы зноў вярталіся да творчага палёту.

Кніга выйшла. Да яе выдання з цікавасцю паставілася кіраўніцтва і рэдактары «Мастацкай літаратуры». Нам бачылася, што яе добра прымуць чытачы. Увогуле, так і атрымалася. Тыраж кнігі разышоўся хутка. Але зусім нечакана для нас да гэтай працы даволі негатыўна паставіліся... сваякі. Навошта так гаварылі шчыра, некаторыя гісторыі сказілі, усё было не так, пра мяне напісалі зусім не тое... Цяжкая гэта справа, пісьменніцтва.

***— Сёння ў Беларусі ўсё папулярней робіцца ўнутраны турызм — больш і больш маладых людзей ездзяць па нашай роднай краіне, адкрываючы для сябе яе замкі, храмы, сядзібы, капліцы, гістарычныя помнікі, а значыць, яе такую багатую і ўсё яшчэ не да канца спазнаную гісторыю... Якія гістарычныя помнікі Беларусі вам дарагія, якія вы для сябе аднойчы адкрылі і ўразіліся, куды б параілі абавязкова з'ездзіць, каб лепей спазнаць родную Беларусь?***

— У абавязкі міністра ўваходзіць рэгулярны прагляд прэсы. Гэта зваротная сувязь, грамадскі аналіз прынятых рашэнняў. І вось аднойчы мне на вочы трапілася нататка маладой мамы. Яна пісала, што яе муж — заўзяты рыбак, на выхадныя саджае яе і двух іх сыноў у машыну, і яны выязджаюць на рэчку або на возера. Пры гэтым заўсёды ў розныя месцы. Муж садзіцца на беразе і надоўга замірае з вудамі, хлапчукі доўга на адным месцы сядзець не могуць, і ўзнікае праблема, чым іх заняць. А я, піша гэтая мама, па вонкавых прыкметах бачу, што кожны раз мы трапляем у памятныя месцы. Дзесьці засталіся падмуркі ад старой сядзібы і побач запушчаны, але яшчэ пазнавальны парк, а ў гэтым месцы відавочна ішлі кровапралітныя баі, да гэтага часу бачныя шнары-акопы, а тут, падобна, б'е з-пад зямлі старажытная крынічка. Мне б пра ўсё гэта расказаць дзецям, але я нічога не ведаю пра гэтыя мясціны і нідзе не знаходжу паказальнікаў-падказак, каб прасякнуцца гісторыяй і прыгажосцю роднага краю.

Я расказаў пра гэта калегам, і мы вырашылі распрацаваць адукацыйна-патрыятычную праграму «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся!». Пачаць яе рэалізацыю з кожнай школы, дзе настаўнікі з дзецьмі і іх бацькамі для пачатку знайшлі б і абазначылі на карце ўсе памятныя і знакавыя месцы (прыродныя, гістарычныя, культурныя). Затым трэба было пазначыць іх ужо на мясцовасці — шыльдачкай, агароджай, альтанкай. Мы планавалі з часам прыцягнуць да гэтай працы мясцовыя ўлады і нават структуры ДАІ для распрацоўкі і усталёўкі адпаведных дарожных паказальнікаў. І справа пайшла! Прынамсі, школы за гэтую працу ўзяліся з энтузіязмам. Да гэтай ідэі рэалізацыі патрыятычнага выхавання мяне ў свой час падвёў вядомы ў Беларусі археолаг Вячаслаў Фёдаравіч Капыцін. Ён са студэнтамі абышоў-аблазіў Верхняе Падняпроўе, пазначыўшы на карце і на мясцовасці ўсе археалагічныя помнікі гэтага рэгіёна. Днём — знясільвальная праца з лапатай, назойлівая машкара і пякучае сонца, карпатлівыя навуковыя нататкі, а ўвечар ля вогнішча — займальныя аповеды аб плямёнах, якія здаўна засялялі нашы дабрадатныя і найпрыгажэйшыя мясціны, юшка, звараная тут жа на вогнішчы, песні пад гітару. Вось прадметнае выхаванне любові да сваёй зямлі, яе гісторыі, да людзей, якія яе тварылі. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка студэнтам гістфака таксама ўдзельнічаў у гэтых археалагічных экспедыцыях пад кіраўніцтвам дацэнта Капыціна. Можна быць упэўненым, што і яны ўнеслі свой уклад у фарміраванне сапраўднай любові да Беларусі нашага Прэзідэнта.

Развіваючы ідэю адукацыйна-патрыятычнага выхавання школьнікаў і студэнтаў, мы вырашылі арганізаваць сістэмныя экскурсіі па краіне, акрэсліўшы сем асноўных памятных мясцін, якія абавязаны наведаць кожны беларус. Па адным у кожным рэгіёне. Але ж да знакавых мясцін трэба аднесці не толькі старажытныя гістарычныя, прыродныя і культурныя помнікі, але і сучасныя вытворчасці, якімі мы славімся ва ўсім свеце. Паспрабавалі спачатку вызначыць гэтыя мясціны. І адразу сутыкнуліся з непераадольнымі цяжкасцямі. Такіх аб'ектаў аказалася значна больш, і выбар з іх сямі найважнейшых пагражаў ператварыцца ў гарачыя і бясконцыя спрэчкі.

У Мінску — Палац Незалежнасці, музей Вялікай Айчыннай вайны, трактарны завод, МАЗ, «Гарызонт», Вялікі тэатр, Акадэмія навук...

У Мінскай вобласці — Нясвіж, Хатынь, Курган Славы, БелАЗ, парк «Вялікі Камень», Лінія Сталіна, Салігорскі калійны камбінат...

**«Сямейнае апавяданне цікава найперш самым блізкім, а ці захопіць яно шырокае кола чытачоў — вялікае пытанне. Ды і колькасць гісторый пра сваіх родных толькі спачатку здаецца невычэрпнай. Варта ўзяцца за іх пісьмовы пераказ, і яны тут жа заканчваюцца. Ды і пісаць трэба ўмець».**

У Брэсцкай вобласці — Брэсцкая крэпасць, Белавежская пушча, Косаўскі замак, «Савушкін прадукт», археалагічны музей «Бярэсце», Камянецкая вежа, Ружанскі замак...

У Віцебскай вобласці — старажытны Полацк, Аршанскі льнокамбінат, Летні амфітэатр «Славянскага базару», «Нафтан», мемарыяльны комплекс «Прарыў», Дом-музей Марка Шагала, Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры»...

У Гродзенскай вобласці — Каложская царква, Стары замак, Мірскі замак, Лідскі замак, касцёл у Гервятах, Жыровіцкі манастыр, «Гроднаазот»...

У Гомельскай вобласці — Палац Румянцавых і Паскевічаў, музей прыроды ў Ляскавічах, «Гомсельмаш», Юравіцкі манастыр, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, Жлобінскі металургічны завод, Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат...

У Магілёўскай вобласці — Буйніцкае поле, Магілёўская ратуша, Бабруйская крэпасць, «Белшына», Горацкая акадэмія, «Магілёўхімвалакно», «Беларускі цэментны завод»...

У кожнай вобласці ўжо сем знакавых аб'ектаў! Дык гэта толькі на мой густ. Колькі па нашай краіне найпрыгажэйшых прыродных ландшафтаў, гістарычных помнікаў, аб'ектаў культуры і магутных сучасных прамысловых прадпрыемстваў?! Ёсць чым ганарыцца і ёсць што паказаць кожнаму беларусу і гасцям нашай краіны.

Наша праграма абавязковага наведвання сямі знакавых месцаў кожным беларусам затармазілася яшчэ і таму, што ў апошнія гады... беларусы сталі жыць лепш. Практычна ў кожнай сям'і з'явілася легкавая машына, а то і не адна. Людзі сталі сем'ямі з задавальненнем падарожнічаць па краіне. Адпала неабходнасць сістэмнай арганізацыі калектыўных аўтобусных экскурсій, як у савецкі час. Аднак планамерная праца над аднаўленнем і захаваннем помнікаў нашай нацыянальнай культуры актуальная. Кожны чалавек павінен ведаць і любіць сваю Радзіму.

**Падрыхтавала
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# РЭЛЬЕФНЫЯ І ТЫФЛАГРАФІЧНЫЯ

## «Белкартаграфія» распрацоўвае новы для Беларусі напрамак — тактыльную картаграфію

**Карты і атласы, якія выпускае «Белкартаграфія», зручна ўзяць з сабою падарожнікам і аўтааматарам, па іх вучацца беларускія школьнікі і студэнты, а такія дапаможнікі на замежнай мове незаменныя для іншаземных турыстаў. З 2021-га магчымасць «убачыць» свет рукамі спецыялісты прадпрыемства ствараюць і для тых, хто інакш пабачыць навакольле не можа.**

**Ва ўстановах адукацыі зарэгістравана 2662 школьнікі з абмежаванымі магчымасцямі па зроку. З іх 487 чалавек вучацца ў шасці школах-інтэрнатах.**



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Галоўны рэдактар прадпрыемства «Белкартаграфія» Галіна ЛЯХАВА.

### СПОСАБ ПАЗНАЦЬ СВЕТ

Спецыялізаванае картаграфічнае прадпрыемства «Белкартаграфія», якім кіруе Іна Шлык, стварае навукова-даведачныя, турыстычныя, аўтадарожныя карты і атласы; атласы, насценныя карты і контурныя карты для навучальных устаноў; тэматычныя і прадстаўнічыя карты; карты і атласы на замежных мовах і шмат іншай картаграфічнай прадукцыі.

Карта — спосаб пазнаць свет. І з такім візуальным спосабам няма праблем у звычайных карыстальнікаў. А вось для людзей з абмежаванымі магчымасцямі (невідушчых ці слабавідушчых) такі падыход немагчымы. Каб пазнаёміцца з сусветам, ім патрэбны тактыльныя карты, рэльефныя выявы на якіх яны змогуць «убачыць» рукамі.

Стварэннем тактыльных і тыфлаграфічных карт прадпрыемства «Белкартаграфія» пачало займацца два гады таму, папярэдне вывучыўшы методыкі і распрацоўкі краін, дзе гэты напрамак ужо рэалізоўваецца.

— Інфармацыя на картах прадстаўлена ў выглядзе рэльефнай выявы для людзей, якія не бачаць, але могуць адчуваць пальцамі. Гэта асабліва важна для адукацыйных устаноў, бо камплект картаграфічных дапаможнікаў, якія дазваляе візуалізаваць інфармацыю, існуе па геаграфіі і гісторыі для ўсіх класаў школы і ВНУ, — расказала **галоўны рэдактар прадпрыемства «Белкартаграфія» Галіна ЛЯХАВА.** — Пачаўшы стварэнне тактыльных карт, мы сутыкнуліся з адсутнасцю апрабаваных методык па вырабе такой прадукцыі. Пэўныя распрацоўкі ў свеце існуюць, і спосабаў стварэння тактыльных карт шмат, аднак няма вызначаных рэкамендацый, як гэта рабіць.

### НА ПЛАСТЫКУ І МІКРАКАПСУЛЬНАЙ ПАПЕРЫ

Беларускія спецыялісты выбралі для сябе два спосабы. **Друкаванне тактыльных карт на УФ-прынтары.** Гэты метад дазваляе сумяшчаць каляровую выяву (для людзей з парушэннямі зроку) з рэльефным слоем (для невідушчых), які ствараецца на пластыкавай аснове празрыстым лакам.

— Мы выбралі гэты спосаб, бо рэльефная выява тут не перашкаджае каляровай. Тыя, у каго слабы зрок, бачаць колер карты, а празрысты лак, які стварае інфармацыйны рэльеф для тых, хто не бачыць, не замінае ўспрымаць карту людзям, у якіх ёсць астаткавы зрок, — патлумачыла спецыяліст. — У рабоце выкарыстоўваюцца лакі і чарніла, якія хутка зацвярджаюцца пад уздзеяннем ультрафіялету. Гэты метад дарагі, аднак яго перавага ў тым, што выява доўга захоўваецца на аснове, і картамі, надрукаванымі на УФ-прынтары, могуць карыстацца як невідушчыя, так і людзі з астатковым зрокам.

**Друкаванне рэльефнай выявы з дапамогай p.i.a.f-печы** — другі спосаб, апрабаваны супрацоўнікамі «Белкартаграфіі». Рэльефная выява такім метадам ствараецца з чорнай фарбы, якая наносіцца на мікракапсульную рэльефную паперу, а пад уздзеяннем высокіх тэмператур у печы выява робіцца рэльефнай.

— Гэты спосаб крыху горшы за папярэдні, бо празмернасць чорнага колеру крыху рабіць. Невідушчыя гэтага не бачаць, аднак слабавідушчым перашкаджае ўспрымаць інфармацыю.





### ФІЗІЧНАЯ КАРТА БЕЛАРУСІ І ПЛАНЕТЫ СОНЕЧНАЙ СІСТЭМЫ

Візуальна тактыльная карта выглядае нібыта і проста, аднак за яе вырабам стаіць вялізная праца. Ствараючы тактыльныя карты, спецыялісты «Белкартаграфіі» працуюць разам з тыфлапедагогамі 188-й школы Мінска. Яны ўжо пратэсціравалі і станоўча ацанілі эксперыментальныя работы: тактыльную карту «Рэспубліка Беларусь. Фізічная карта» і схему «Планеты Сонечнай сістэмы».

Завяршаецца работа па адаптацыі вучэбнага атласа для 4 класа «Чалавек і свет. Мая Радзіма Беларусь». Для відушчых дзяцей гэта звычайны друкаваны атлас, а для невідушчых ён будзе зроблены ў выглядзе альбома карт, паведаміла Галіна Ляхава:

— Пры гэтым трэба ўлічваць магчымасці слабавідушчых дзяцей, бо яны не могуць успрыняць столькі ж матэрыялу тактыльна (у выглядзе знакаў) на адной карце, як відушчыя дзеці. Немагчыма ўказаць, напрыклад, на палітыка-адміністрацыйнай карце краіны 118 раёнаў, якія абазначаны ў звычайным атласе. Таму для невідушчых адну карту прыходзіцца дзяліць на чатыры-пяць асобных і на іх указваць пэўную інфармацыю. На адной, напрыклад, абазначаны межы абласцей, на іншай — гідраграфія (асноўныя рэкі), на трэцяй — асноўныя гарады абласцей і г. д. Тое ж самае і са спецыяльнай вучэбнай і мастацкай прадукцыяй для людзей з праблемамі зроку, якая ў Беларусі выпускаецца з 1997 года. Замест аднаго падручніка можа быць некалькі шрыфтам Брайля.

На прадпрыемстве і далей будзе прадоўжана работа па стварэнні тактыльнай прадукцыі, каб для вучняў з абмежаваннямі па зроку былі створаны роўныя са звычайнымі школьнікамі ўмовы.

**Ірына СІДАРОК, Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 190024351

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае падзяку за ўдзел у падрыхтоўцы матэрыялу дырэктару РУП «Белкартаграфія» Іне ШЛЫК.

# МАРА АБ НЕБЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Адзін з маіх самых яркіх успамінаў дзяцінства — як сям'ёй ездзілі на поле: мы, дзеці, запускалі ў неба паветраных змеяў, а тата — свае самалёцікі, — кажа Вераніка. — Яны хоць былі і невялікія, але мелі сапраўдны рухавік, які трэба было запраўляць бензінам.

Захапіўся канструяваннем Мікалай Качан яшчэ са школы, з 12 гадоў займаўся ў авіямадэльным гуртку, разам з іншымі хлопцамі ездзіў на зборы.

— Да 50 гадоў тата працаваў звычайным кіроўцам аўтакрана. З яго ўдзелам у 70—80-х было пабудавана шмат прамысловых будынкаў, аэрапорт Мінск-2, — расказвае Вераніка. — Калі тату споўнілася 50, я спытала ў яго: «Ці ёсць у цябе нейкая мара?» І ён прызнаўся, што ў маладосці трызніў аб небе. Казаў, што калі б пазней сустрэў маму, то стаў бы лётчыкам. Але з'явіліся дзеці і прыйшлося думаць не пра мару, а аб тым, як пракарміць сям'ю. ...І, што вы думаеце, неўзабаве пасля той размовы я выпадкова даведалася, што тата знайшоў курсы, дзе навучаюць пілотаў. Вы бы бачылі, з якім энтузіязмам ён хадзіў туды на заняткі ды рыхтаваўся да экзаменаў. У выніку паспяхова здаў іх і атрымаў пасведчанне пілота. Распавядаў, што вучыўся з людзьмі, у якіх былі свае прыватныя самалёты. Ніколі не забуду, як, калі мы з будучым мужам скакалі з парашутам, ён падтрымліваў мяне з кабіны пілота.

Нейкі час Мікалай Дзмітрыевіч працаваў у Мінскім авіяцыйным тэхнічным вучылішчы грамадзянскай авіяцыі ў канструктарскім бюро, збіраў самалёты, потым стаў інструктарам і навучаў лётнай справе курсантаў.

— Аднойчы, калі мае дзеці былі яшчэ маленькімі, мы ездзілі да таты на працу на экскурсію, гэта было вельмі цікава. Але самым



незабыўным уражаннем для ўсёй нашай сям'і стаў юбілей маёй бабулі. Тата вырашыў зрабіць на 85-годдзе сваёй мамы сюрпрыз — і прыляцеў у вёску Каліта, што ў Чэрвеньскім раёне, на самаробным двухмесным самалёце. Першай спраўй прапанаваў пакружыць з ім над вёскай імянінніцы. Бабуля адмовілася, аб чым потым моцна шкадавала. У выніку з татам паляцела я. Гэта было нешта неверагоднае. З усёй вёскі сабраліся людзі: хто — на кані, хто — на веласіпедзе. Было такое адчуванне, што бабуля памаладзела гадоў на 20 — столькі было на яе твары захаплення, эмоцый.

— А можна мне палётаць з вашым татам? — пацікавілася я, уяўляючы, які неверагодны можа атрымацца фотарэпартаж для газеты.

— На жаль, гэта немагчыма. Тата перанёс складаныя аперацыі на галаўным мозгу. Атрымаў групу інваліднасці. Яму цяпер нельга кіраваць самалётам, — на вочы Веранікі наворочваюцца слёзы. — Тату 69. І я вельмі рада, што ён паспеў спраўдзіць мару ўсяго свайго жыцця — узняцца ў неба. Бо да 50 гадоў ён ні разу не лётаў на самалёце, нават у якасці пасажыра... Я да глыбіні душы ўдзячная тату за тое, што ён паказаў нам, сваім дзецям і ўнукам, што не трэба баяцца, што на шляху да запаветнай мары ўзрост не перашкода. Гэтая гісторыя, спадзяюся, будзе маяком не толькі для нашай сям'і, але і для ўсіх людзей, якія прачытаюць гэты артыкул.

Дарэчы, муж Веранікі Піванковай у дзяцінстве захапляўся спортам. А потым сышоў у бізнес. Шмат гадоў усю энергію і час прысвячаў рабоце. І вось, натхніўшыся ў тым ліку і прыкладам цесця, у свае 45 запісаўся на курсы, дзе навучаюць фітнес-інструктараў.

— Ён пайшоў вучыцца не для таго, каб змяніць работу, — удакладняе Вераніка. — У першую чаргу для сябе, каб павысіць узровень ведаў у гэтай тэме, бо апошнім часам ён актыўна трэніруецца ў спартзале. А яшчэ, дзякуючы нашым сямейным падарожжам па Беларусі, падчас якіх мы пазнаёміліся з рознымі цікавымі людзьмі, муж адрадзіў сваю даўнюю мару і цяпер праходзіць курсы па дайвінгу, каб атрымаць сертыфікат і паглыбляцца пад ваду ў любым пункце свету. Я яго падтрымліваю, як падтрымлівала і свайго тату, калі той ішоў да сваёй мары. Бо разумею, што для мужчыны вельмі важна мець захапленне, ад якога свеціцца вочы. Гэта дае зарад энергіі не толькі яму, але і ўсёй сям'і. У нас з мужам чацвёра дзяцей. Калі яны бачаць, што бацькі чымсьці захоплены, у іх таксама з'яўляецца патрэба чымсьці захапляцца. Бо ў іх перад вачыма ёсць жывы прыклад, які з'яўляецца падмуркам у выхаванні. Педагог і шматдзетны тата Яўген Ісачанка, ці проста дзядзька Жэня, з якім я арганізоўвала сустрэчы ў нашым горадзе, пастаянна аб гэтым кажа.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота з архіва героеў.**

Сезон

# На норы на бабра і выдру

**З 1 верасня адкрываецца паляванне на бабра і выдру, якое працягнецца да 31 сакавіка.**

Здабыча бабра і выдры дазваляецца як ружэйным (з засады, з падыходу, з пад'езду з маламерных суднаў, на норах), так і безружэйным (на норах, з выкарыстаннем капканаў або пастак (акрамя петляў) спосабамі, інфармуе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслліннага свету.

У якасці прылад палявання дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўляў, гладкаствольную зброю з патронамі з куляй ці карцеччу, паляўнічыя лукі і арбалеты, пры паляванні з пад'езду — маламерныя судны без рухавіка або з непрацуючым рухавіком, паляўнічых сабак (акрамя ганчакоў і хартоў), капканы, пасткі (акрамя петляў).

Паляванне дазваляецца як у светлы, так і ў цёмны час сутак. Пры безружэйным паляванні з капканамі або пасткамі іх устаноўка (зняцце), праверка, настаўлянне і выманне здабытых жывёл дапускаюцца толькі ў светлы час сутак. Ружэйнае або безружэйнае паляванне на норах, а таксама ружэйнае паляванне з пад'езду з маламерных суднаў дапускаецца толькі ў светлы час сутак.

У Дзяржінспекцыі звяртаюць асаблівую ўвагу паляўнічых, што ружэйнае паляванне на бабра і выдру ў цёмны час сутак дазваляецца спосабамі з засады, з падыходу і толькі па разавых паляўнічых пуцёўках да дазволу (тэрмінам дзеяння не больш за 24 гадзіны), а таксама з абавязковым прызначэннем і ў прысутнасці кіраўніка палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Химремонт».

**Аукцион состоится 29.09.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | Лот № 1 |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона. Начальная цена продажи. Сумма задатка** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120371 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гаражи – бытовые помещения), общей площадью 1423 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Г;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160710 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 224,40 м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, канализационная сеть к зданию 6Г;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160711 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – слаботочные сети), протяженностью 134,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, слаботочные сети к зданию 6Г;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160706 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 71,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, водопроводная сеть к зданию 6Г;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160713 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть (ливневая)), протяженностью 38 м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, канализационная сеть (ливневая) к зданию 6Г;<br>- озеленение территории (липа – 5 шт., береза – 1 шт., ясень – 1 шт., вишня – 3 шт., тополь – 1 шт.)<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001010705, площадью 0,9939 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного автомобильного транспорта), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Г. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в санитарно-защитной зоне организаций, сооружений и иных объектов, код – 8.1, площадью 0,9939 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5.1, площадью 0,0254 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0286 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, код – 5.6, площадью 0,0286 га.<br>Начальная цена продажи лота – 97 901,81 р. (девяносто семь тысяч девятьсот один рубль восемьдесят одна копейка) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 9 790 р. (девять тысяч семьсот девяносто рублей) |

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона.Начальная цена продажи. Сумма задатка** | ЛОТ 2:<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120364 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех пропитки древесины), общей площадью 1600,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120369 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад фенолоспиртов), протяженностью 103,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, канализационная сеть к зданию 6Д/4;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120365 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пилорама), общей площадью 146,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д/1;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-99179 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – ЦТП), общей площадью 51 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д/3;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120358 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – материальный склад цемента – цех приготовления шпатлевки), общей площадью 58,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д/2;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120359 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – полигон железобетонных изделий), общей площадью 1279,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д/5;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160747 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – слаботочные сети), протяженностью 23,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, слаботочные сети к зданию, 6Д;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160748 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 242,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д, водопроводная сеть;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160727 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть (ливневая)), протяженностью 207,5 м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д, водопроводная сеть;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160746 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 135,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, канализационная сеть к зданию, 6Д;<br>- озеленение территории (Озеленение территории (ива плакучая – 1 шт.));<br>- емкость 58 куб. м (2 шт.).<br>Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001010704, площадью 0,9508 га (назначение – земельный участок для обслуживания объектов обрабатывающей промышленности, здания специализированного энергетики, складов, хранилищ), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Д. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в санитарно-защитной зоне организаций, сооружений и иных объектов, код – 8.1, площадью 0,9508 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5.1, площадью 0,0040 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0220 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, код – 5.6, площадью 0,1754 га.<br>Начальная цена продажи лота – 332 347,56 р. (триста тридцать две тысячи триста сорок семь рублей пятьдесят шесть копеек) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 33 234 р. (тридцать три тысячи двести тридцать четыре рубля) |

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона. Начальная цена продажи. Сумма задатка** | ЛОТ 3:<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120362 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склады), общей площадью 1020,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120368 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – арочный склад № 1), общей площадью 457 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е/2;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-120367 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – арочный склад № 2), общей площадью 457 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е/3;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-99178 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж), общей площадью 74,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е/1;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160715 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 93,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, водопроводная сеть к зданию 6Е;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-160726 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть (ливневая)), протяженностью 208,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е, канализационная сеть (ливневая);<br>- озеленение территории (береза – 3 шт., вишня – 3 шт., яблоня – 2 шт., липа – 4 шт. (из них 1 шт. с 4 стволами), ясень – 1 шт., всего – 13 шт.).<br>Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000000101010699, площадью 0,9900 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного автомобильного транспорта, здания и сооружений специализированного складов, хранилищ), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6Е. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в санитарно-защитной зоне организаций, сооружений и иных объектов, код – 8.1, площадью 0,9900 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0542 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, код – 5.6, площадью 0,151 га.<br>Начальная цена продажи лота – 143 331,23 р. (сто сорок три тысячи триста тридцать один рубль двадцать три копейки) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 14 333 р. (четырнадцать тысяч триста тридцать три рубля) |

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона. Начальная цена продажи. Сумма задатка** | ЛОТ 4: капитальное строение, инв. № 400/С-107487 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад лаков и красок), общей площадью 63,4 кв. м, расположенное по адресу г. Гродно, ш. Скидельское, 6А/3.<br>Лот № 4 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001009516, площадью 0,0307 га (назначение – для обслуживания склада лаков и красок), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 6А/3.<br>Начальная цена продажи лота – 35 118,04 р. (тридцать пять тысяч сто восемнадцать рублей четыре копейки) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 3 511 р. (три тысячи пятьсот одиннадцать рублей) |
| **Условия проведения аукциона** | Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – 27 сентября 2023 г. до 15.00 |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.04.2023 | |

## БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Капитальное строение с инвентарным номером 731/С-10788, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Климовичи, ул. Пролетарская, 16, общей площадью 101 кв. м, год постройки – 2001** |
| **Начальная цена продажи** | 20482,81 (двадцать тысяч четыреста восемьдесят два белорусских рубля 81 копейка), в т. ч. НДС 20 % – 3413,80 (три тысячи четыреста тринадцать белорусских рублей 80 копеек) |
| **Сумма задатка** | 1024,14 (одна тысяча двадцать четыре белорусских рубля 14 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | 10.10.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал. |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 09.10.2023 включительно по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 71А-2, 5-й этаж, кабинет 502 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 752155, моб. 8029-169-39-68 |

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 1024,14 белорусского рубля на счет № BY69AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 10 октября 2023 г. с 10.30 до 10.55. В случае нерегистрации в вышеназначенное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на оценку здания, подготовку и проведение аукциона.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Каток грунтовый вибрационный CATERPILLAR CS-563E, рег. знак КА-7 0688, 2007 г. в., инв. № 1385** | 80 520,00 | 8 052,00 | 4 026,00 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение:** Минский р-н, Боровлянский с/с, пос. Опытный, ул. Лагерная, 20 | | | | |
| Обременения (ограничения): лот № 1 является предметом залога (залогодержатель – ООО «Армет») | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **3 октября 2023 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 31 августа 2023 года до 16.00 29 сентября 2023 года | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 03.10.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Рэмантантныя маліны больш ураджайныя чым звычайныя, але і патрабаванні ў іх крыху завышаныя. Справа ў тым, што на двайное плоданашэнне сыходзіць шмат сілкавання, і раслінам гэта трэба неяк кампенсаваць. Калі махнуць на іх рукой, кусты зарастуць парасткамі, а ягады стануць драбнець, у шматлікіх сартоў будуць рассыпацца пры зборы на зярнятκі.**

# Што трэба рэмантантным малінам?



### У першую чаргу — абразанне

Цяпер трэба прайсці і выразаць усе парасткі, якія адпладаносілі. Гэта значыць двухгадовыя. Яны ўжо аддалі свой ураджай і толькі загушчаюць кусты, дзеляцца з маладымі парасткамі шкоднікамі і хваробамі. А значыць, іх трэба выдаліць і спаліць. Разам з імі выдаліце і слабыя тонкія парасткі. Пакідаючы толькі наймацнейшыя ў колькасці не больш за пяць-восем на куст або па 15 парасткаў на пагонны метр рада. Калі пакінуць усе парасткі, то ягад будзе шмат, але яны будуць дробнымі і ўраджай будзе не нашмат большы.

Падчас абразання ў пакінутых парасткаў выдаліце ніжняе лісце. Гэта перанакіруе харчаванне на плоданашэнне і палепшыць вентыляцыю кустоў. Лісце таксама трэба адправіць на вогнішча.

### Чым падкарміць, каб ягады сталі салодкімі?

Так, ёсць і такія падкормкі. Калі азот адказвае, у асноўным, за памеры пладоў і парасткаў, то фосфар і калій паляпшаюць смакавыя якасці і павялічваюць вызяванне галін, паляпшаюць імунітэт. Робяць ягады больш транспартабельнымі, а кусты лепш супрацьстаяць кароткачасовай засусе.

Цяпер самыя важныя — калійныя ўгнаенні. Уносяць іх па дзве запалкавыя ўпакоўкі на 10 л вады. Падкорм праводзяць два-тры разы з інтэрвалам у 7-10 дзён. Можна выкарыстоўваць сернакіслы калій ці проста попел. Попелу спатрэбіцца дзве шклянкі на 1 м$^2$.

Вельмі добрае ўгнаенне — монафасфат калію. Каштуе яно нямала, але сваіх грошай заслугоўвае. У сувязі з высокім коштам монафасфат калію прымяняюць па лісці, каб выкарыстоўваць максімальна эфектыўна і маленькімі дазіроўкамі. Літаральна 2-3 ст. лыжкі на 10 л вады. Праз два-тры дні пасля пазакаранёвай падкормкі правядзіце апырскванне раслін простай вадой: гэтыя прыём дазволіць паўней выкарыстоўваць прыменёнае ўгнаенне.

### Як быць з кляшчом?

Белыя плямы на лісточках, абсыпанне ніжняй лістоты — усё кажа аб наяўнасці кляшча. Знішчыць яго можна без шкоды для свайго здароўя сернымі прэпаратамі. Напрыклад, «Кумулусам» або калоідны серай. Толькі апырскваць імі кусты можна ў прахалоднае надвор'е. Калі стаіць спякота, сярністыя прэпараты выклікаюць апёкі лісця.

Мульчыраванне не пашкодзіць.

### Чым прыкрыць?

Вельмі дабратворна на малінах адбіваецца мульчыраванне глебы саломай. Цяпер якраз ідзе ўборка, а значыць, салому знайсці нескладана. Толькі не паскупіцеся: каб атрымаць станоўчы эфект, салому трэба насыпаць пластом не менш за 10 см, а лепш адразу насыпаць па 20 см, яна ўшчыльніцца і асядзе. Затое потым паліваць маліны можна радзей і пустазелле расце не так актыўна. Мульчыраванне значна павялічвае ўраджаі і зімаўстойлівасць кустоў. Калі ёсць магчымасць, замульчыруйце пасадкі.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.15 | 20.03 | 13.48 |
| Віцебск — | 6.02 | 19.56 | 13.54 |
| Магілёў — | 6.05 | 19.54 | 13.49 |
| Гомель — | 6.05 | 19.47 | 13.42 |
| Гродна — | 6.31 | 20.18 | 13.47 |
| Брэст — | 6.34 | 20.16 | 13.42 |

### Месяц

*Поўня ў 4.35.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

**Пр.** *Георгія, Дзяніса, Емяльяна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Рыгора, Яўгена.*
**К.** *Ізабелы, Паўліны, Багдана, Марка, Раймунда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты. Падзеі. Людзі

**31 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1908** год — нарадзіўся Леанід Сямёнавіч Персіянінаў, беларускі і расійскі навуковец у вобласці акушэрства і гінекалогіі, акадэмік АМН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1951—1958 гг. — загадчык кафедры Мінскага медыцынскага інстытута. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1968).



**1916** год — нарадзілася Зінаіда Іванаўна Браварская, актрыса, рэжысёр, педагог, народная артыстка Беларусі. Сцэнічную дзейнасць пачала ў Тэатры юнага гледача ў Беларусі. З 1938-га — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Здымалася ў кіно, у тэлевізійным спектаклі. Аўтар і рэжысёр радыёпастановак. У 1953—1955 гг. і 1967—1988 гг. выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Ёй прысвечаны дакументальны фільм «Брава, Браварская!»

**1948** год — нарадзіўся Васіль Аляксандравіч Шырко, беларускі пісьменнік. Напісаў кінасцэнарый «Песня пшанічнага поля». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

У свеце

**1749** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Радзішчаў, рускі мысліцель, пісьменнік. Заснавальнік рускай рэвалюцыйнай педагогікі, этыкі і эстэтыкі, рэалістычнага метаду ў рускай прозе. Аўтар філасофска-публіцыстычнага трактата «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву», оды «Вольнасць» і іншых. У 1790-м заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць, прысуджаны да смяротнага пакарання, замененага ссылкай на 10 гадоў у Сібір. У ссылцы напісаў філасофскі трактат «Пра чалавека, пра яго смяротнасць і неўміручасць».



**1874** год — нарадзіўся Вячаслаў Рудольфавіч Мянжынскі, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Удзельнік падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Член рэдкалегіі газет «Салдат» і «Праўда». Як камісар ВРК у Дзяржбанку і першы наркам фінансаў праводзіў нацыяналізацыю банкаў, стварыў новы фінансавы апарат савецкай рэспублікі.

**1921** год — нарадзіўся Вячаслаў Міхайлавіч Каўтуненка, расійскі канструктар ракетнай і касмічнай тэхнікі, член-карэспандэнт РАН і АН УССР, доктар тэхнічных навук, Герой Сацыялістычнай Працы. Быў галоўным канструктарам, тэхнічным кіраўніком праекта «Венера — камета Галея».

**1949** год — нарадзіўся Рычард Гір, амерыканскі кінаакцёр.

**1953** год — нарадзіўся Павел Уладзіміравіч Вінаградаў, лётчык-касманаўт Расійскай Федэрацыі, Герой Расійскай Федэрацыі (1998).

Так гаварылі...

**СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ:**

*«Шчасце ў кожнай тваёй перамозе,*
*Шчасце — адолець і вецер, і град,*
*Шчасце — нідзе не спыняцца ў дарозе,*
*Спынішся — плынню адгоніць назад».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Дачка, выбірай у мужы скупога мужчыну.

— Чаму, мама?

— І на дыетах сядзець не трэба, і на палюбоўніц выдаткаў не будзе.

**Аддаў дачку на курсы нестандартнага мыслення ў нядзельную школу. Заняткі па серадах.**

Магчыма, вяселле абышлося б і без бойкі, але маладыя пачалі адкрываць канверты.

**— Сынок, калі ж ты нарэшце жэнішся: у іншых ужо даўно сям'я, дзеці.**

**— Мама, я ніяк не магу знайсці сабе пару.**

**— Ты хоць адну сабе знайдзі, сынок.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмны – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.431. Індэкс 63850. Зак. № 1864.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12